КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №13 (141)
◂ 10 КРАСАВІКА ◂ 2009 г.

# Новы Час



НОВАЯ АПАЗІЦЫЯ МАЛДОВЫ

Стар. 12

**ЧАМУ СЫШОЎ НАВУМАЎ**

Самай гучнай падзеяй апошніх дзён стала адстаўка міністра ўнутраных спраў Беларусі Уладзіміра Навумава...

Стар. 4

**УЛАСНЫЯ ГРОШЫ ЯК ВЫЙСЦЕ З КРЫЗІСУ**

Не хапае з-за крызісу беларускіх рублёў, долараў і еўра? Завядзіце свае ўласныя грошы...

Стар. 13

**КУПАЛАСЛЭМ З БУЛЬВАРА КАПУЦЫНАЎ**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Чарнобыльскі шлях: у палоне традыцый**

У матэрыялах Вольгі Хвоін

▸ АД РЭДАКТАРА

# ГЕНАДЗЬ КАРПЕНКА. 50 ПЛЮС 10

*Аляксей КАРОЛЬ*

**Генадзь Карпенка пражыў няпоўных 50 год. 10 год мінула пасля яго нечаканай, заўчаснай і трагічнай смерці. Няпоўных 50, але пражытых так і на такім запале, каб назаўжды застацца ў людской памяці і ўвайсці ў гісторыю.**



Гісторыю Беларусі на яе складаным, супярэчлівым і драматычным этапе — барацьбы за незалежнасць і дэмакратыю. Пасмяротнае дзесяцігоддзе толькі пацвердзіла як маштаб яго асобы, так і яго ўплыў на ход сучасных яму падзей. Атрымалася — на ход гісторыі, які, відавочна, быў бы шмат у чым іншы, каб няведамы нам збег таямнічых абставін не абарваў яго жыццё.

Увайшоў у гісторыю — слабое суцяшэнне для родных і блізкіх, сяброў і саратнікаў. І нават зусім ім не патрэбнае. І тым не менш неабходнае нам усім. Не толькі, каб аддаць належнае памяці неардынарнай асобы і выбітнаму палітыку, а каб лепш усвядоміць, чаго не хапіла, у чым памыляліся і што неабходна нам сёння, каб годна завяршыць тую справу, на алтар якой Генадзь Карпенка і паклаў сваё жыццё. Справу ўсталявання незалежнай і дэмакратычнай, заможнай і паважанай у свеце Беларусі. Дзяржаўнасць ёсць. У тым ліку дзякуючы і яму. Дэмакратыі няма. Таму і гарыць паходня яго справы. У тым ліку дзякуючы і вятрам памяці пра яго.

Сам Генадзь Дзмітрыевіч ніколі і нідзе не абмовіўсянават словам пра гістарычны кантэкст сучасных яму падзей, тым больш пра сваю ролю ў іх. Усур'ёз пра гэта палітыкі разважаюць толькі пасля, на схіле гадоў. Карпенка да мемуараў не дажыў. Быў збіты на ўзлёце свайго чарговага і, не выключана, перламожнага рыўка ў вялікай палітыцы, да вялікіх перамен. Ён жыў у віхурах штодзённых падзей. Але заўсёды трымаў у полі зроку лініі іх перасячэння і ўзаемаабумоўленасці, у развіцці — у часе і прасторы. Быў здольны да крытычнага аналізу сваіх дзеянняў і, галоўнае, да змены алгарытму сваіх паводзін і адносін з людзьмі. І пры гэтым заўсёды заставаўся самім сабой. Лепш быць, а не здавацца — гэта пра яго. Ён ніколі не іграў тую ці іншую ролю, не лавіў кан'юнктуру моманту і не падладжваўся пад настрой той ці іншай аўдыторыі. І дзіўным чынам нарэшце выходзіў на ўзаемапаразуменне з большасцю ў любой аўдыторыі, як у адносна вузкім палітычным асяродку сяброў-супернікаў, так і на масавых сходах і мітынгах — на заводах, універсітэтах, плошчах.

Так атрымалася, што ў сакавіку 1999 года, едучы ў Прагу ў складзе адной дэлегацыі, мы апынуліся з Генадзем Дзмітрыевічам удвух у адным купэ, потым жылі ў адным нумары і разам жа вярталіся. На той момант ён вырашаў для сябе адну складаную праблему: ці ўдзельнічаць у якасці кандыдата ў прэзідэнты ў выбарчай кампаніі па версіі апазіцыі, якую ініцыяваў Віктар Ганчар. Па сутнасці грамадскай кампаніі супрацьву. Або не ўдзельнічаць і захаваць за сабой больш шанцаў для ўдзелу ў сапраўдных выбарах, у непасрэдным супрацьстаянні з А. Лукашэнкам.

Гэтую праблему і абмяркоўвалі амаль усю ноч да Варшавы, а потым з перасадкай і да Прагі. Зразумела, што на гэтую канву нанізваліся і эпізоды палітычнай барацьбы папярэдніх этапаў — перамог і параз, памылак і праліказў, разыходжанняў непаразуменняў.

Тады ўразілі, а потым шматкроць успаміналіся яго словы: «Ну што, ёсць розніца паміж тым Карпенкам, часоў першых прэзідэнцкіх выбараў, і сённяшнім? Я тады то да Кебіча схаджу, то да Пазьняка збегаю. Нельга сядзець паміж дзвюма крэсламі. Трэба заняць цвёрдую пазіцыю. Вызначыць мэту і трымаць мэту. Рыхтавацца самому, рыхтаваць плацдарм і гуртаваць сілы для вырашальнага штурму. Гэтыя выбары — ці не апошняя магчымасць для перамогі, для нашага прарыву да ўлады, а з ёю і да перамен».

Па сутнасці гэтыя словы ёсць ключ да разумення лініі паводзін палітыка Карпенкі пасля прэзідэнцкіх выбараў 1994 года. У яго не было агалцелага імкнення да ўлады. Прынамсі асабістай улады. Яго захаплялі новыя пляцоўкі дзейнасці, маштаб і мэты справы. І таму ён без комплексаў мог штурмаваць новыя вяршыні ў камандзе. Доктар навук, дырэктар завода, мэр Маладзечна, віцэ-спікер Вярхоўнага Савета, лідэр дэмакратычных сіл — гэта знакі яго палёў дзейнасці.

Пасля 1994 года Генадзь Карпенка метадычна, упарта, цярпліва, вынаходліва працуе на аб'яднанне рознакаляровых апазіцыйных сіл. І заваёўвае ў іх шэрагах бясспрэчны аўтарытэт. Праблем з вылучэннем адзінага кандыдата ад дэмакратычных сіл, калі б ён быў жывы, на выбарах 2001 года не ўзнікла б. Аўтарытарная ж сістэма на той час яшчэ не паспела стварыць безадказны механізм свайго самазахавання. Шанец на перамогу ў дэмакратычных сіл быў яшчэ рэальны. Карпенка гэта ведаў. 6 красавіка яго не стала. Па афіцыйнай версіі, у выніку інсульту.

Пры абставінах да гэтага часу нявызначаных. Магчыма, яны адкрыюцца калі-небудзь з дакументаў, што зараз захоўваюцца за сямю пячаткамі ў нейкіх сакрэтных архівах. Магчыма, дакументальны след знішчаны. І таямніца смерці Генадзя Карпенкі назаўжды застанецца нераскрытай таямніцай гісторыі. Але ясна адно: яго імя ўжо назаўжды ўвайшло ў гісторыю Беларусі.



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### МАСТЫ. ТРЫЦЦАЦЬ ГАДОЎ БЕЗ ГАРАЧАЙ ВАДЫ

**Амаль 30 гадоў жыхары 40-кватэрнага дома па вуліцы Будаўнікоў, 16 у горадзе Масты Гродзенскай вобласці чакаюць гарачай вады.**

Дом заселены ў 1982 годзе. Заказчыкам выступіла ўпраўленне капітальнага будаўніцтва райсавета. Каб зэканоміць дзяржаўныя грошы, быў утвораны будаўнічы кааператыў «Вулей». Будучыя жыхары аплацілі не толькі пабудову дома, але і падвядзенне камунікацый, у тым ліку ўнутрыдамавую разводку гарачага водазабеспячэння. Засяліліся, а гарачай вады няма. Часова сітуацыю вырашылі наступным чынам: усталявалі газавыя воданагравальныя калонкі. Такім чынам многія жыльцы дома забяспечвалі сябе гарачай вадой больш за дзесяць гадоў; але тым, хто жыве на верхніх паверхах, даводзілася грэць яе ў каструлях, паколькі з-за слабага ціску вады карыстанне калонкай магло прывесці да выбуху.

У другой палове 1990-х гадоў газавая служба РБ прыняла новыя стандарты ўтрымання грамадзянамі газавых калонак. У гэтым доме не адна з іх не адпавядала стандарту, і таму ўсе яны былі адключаны. Сітуацыя ўскладнілася яшчэ і тым, што цеплатраса мела занадта доўгую працяглась ад кацельні ААТ «Мастоўдрэў», і таму дом быў падключаны да разводкі СШ №5 ды дзіцячага садка. Зімой было холадна ўсім — дарослым і дзецям, таму школу і садок пераключылі да бліжэйшай кацельні сельгастэхнікі, а жыхары дома засталіся надалей узімку мерзнуць.

Абураныя грамадзяне на чале са старшынёй кааператыва Валерам Палішэвічам з 2001 года пачалі перапіску з мясцовай уладай, дзе патрабавалі станоўчага вырашэння пытання цепла- і гарачага водазабеспячэння дома. Першы адказ, які атрымалі кааператыўшчыкі ад райвыканкама за подпісам намесніка старшыні Алены Кір'янавай, быў такі: «Сістэма вашага цеплазабеспячэння знаходзіцца ў задавальняючым стане; магчымы варыянт гарачага водазабеспячэння, шляхам установкі воданагравальніка ў падвале дома, аднак унутрыдамавая разводка гарачага водазабеспячэння выканана больш за 15 гадоў таму, з гэтай прычыны неабходна скласці праект і правесці яе абследаванне». Жыхарам было прапанавана звярнуцца да спецыялістаў «Гроднаграмадзянпраект», якія выконваюць падобныя работы, але іх паслугі платныя. Калі першы этап работы будзе выкананы, то далей адбудзецца вызначэнне кропкі падключэння цеплазабеспячэння, замоўлены праект, сметная дакументацыя і вызначаны асноўныя работы па пераключэнні трасы. І ўсё гэта за кошт жыхароў.

У 2005 годзе, каб у кватэрах было цёпла, людзі заплацілі за матэрыялы і працу мясцовай арганізацыі па пераключэнні цеплазабеспячэння іх дома да кацельні райаграпрамтэхнікі.

Пытанне гарачага водазабеспячэння і па сёння кожны вырашае самастойна. Жыхары апошняга паверха грэюць ваду ў каструлях, тыя, хто ніжэй, усталявалі ўласныя воданагравальнікі і не жадаюць плаціць за агульны. Некаторыя зноў нелегальна падключылі газавыя калонкі.

**Язэп ПАЛУБЯТКА**

### ГРОДНА. ГАРАДСКАЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ: БЕЛАРУСЬ І СВЕТ

**На гістарычным факультэце Гродзенскага дзяржуніверсітэта і на сядзібе гарадской арганізацыі ТБШ адбылася прэзентацыя кнігі доктара гістарычных навук Захара Шыбекі «Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет», якая выйшла ў выдавецтве Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта ў Вільнюсе (Літва).**

Як паведаміў гродзенскі актывіст дэмакратычнага руху Эдуард Дмухоўскі, арганізатарам прэзентацыі выдання выступіла мясцовае аддзяленне руху «За Свабоду».

На думку аўтара кнігі, «сучасныя гараджане сталі закладнікамі ўрбанізацыі, што адбіваецца на іх маральным і фізічным здароўі, бо сённяшнія гарады з'яўляюцца праваднікамі распусты». Каб зрабіць сучасны беларускі горад нацыянальным, яго жыхары «павінны стаць больш аскетычнымі, не зводзіць свае жыццё толькі да задавальнення асноўных фізіялагічным патрэб і засваення рускамоўнай поп-культуры». Як лічыць Шыбека, гараджане павінны адраджаць традыцыі беларускай аўтэнтычнай культуры і навучыцца зарабляць грошы, бо толькі такое спалучэнне дазваляе рэалізаваць духоўныя памкненні чалавека. Аўтар выдання выказаў шкадаванне, што беларускія гарады, у адрозненне ад заходніх, развіваюць не сферу паслуг, а прамысловасць.

Кніга складаецца з трох раздзелаў: гісторыя горада, урбанізацыя, гараджане. «На працягу ўсёй сваёй гісторыі царызм рабіў так, каб разбурыць мясцовы каларыт старых ліцвінска-беларускіх гарадоў і ліквідаваць іх былыя вольнасці. Беларусы пазбавіліся сталіцы. Вільняператваралася ў звычайны губернскі цэнтр. Руска-яўрэйскія гарады адчужаліся ад беларускай народнай культуры. Найбольш зрусіфікаванымі сталі губернскія гарадскія цэнтры. Яны прэзентавалі не аўтахтонную культуру і традыцыю, як раней, а найперш узніклую тут правінцыйную рускую культуры. Старабеларуская шляхецкая культура была загнаная ў панскія маёнткі і асобныя гарадскія цэнтры. Па сваім нацыянальным складзе мясцовыя гарады не сталі беларускімі», — адзначаецца ў кнізе.

**БелаПАН**

---

▸ АДКАЗ

## МТС НЕ ГАВОРЫЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

**Кампанія «Мабільныя ТэлеСістэмы» (МТС) не можа перавесці сваю службу даведкі IVR (0870) на беларускую мову з-за недахопу фінансавых сродкаў.**

Пра гэта гаворыцца ў адказе кампаніі на сумесную заяву міжнароднай моладзевай арганізацыі «Малады фронт» і моладзевай арганізацыі Партыі БНФ «Моладзь БНФ» аб беларусізацыі мабільнай сувязі. Пра гэта паведаміў адказны сакратар «Моладзі БНФ» Антон Койпіш.

Некалькі тыдняў таму актывісты «Маладога фронту» і прадстаўнікі «Моладзі БНФ» перадалі кіраўніцтву кампаніі «МТС» у Беларусі болей за 2 500 подпісаў, а таксама зварот з просьбай перакласці інтэрфейс на беларускую мову, нароўні з англійскай і рускай.

У адказе кампаніі паведамляецца, што СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» ацаніла магчымасць стварэння беларускамоўнай версіі IVR. «З улікам высокага кошту дадзенага праекта яго рэалізацыя ў бягучым годзе не з'яўляецца магчымай. Разам з тым, у выпадку паляпшэння фінансавых паказчыкаў, кампанія паўторна разгледзіць магчымасць рэалізацыі дадзенага праекта ў 2010 годзе», — гаворыцца ў адказе кампаніі.

Акрамя таго, у лісце падкрэсліваецца, што МТС прыкладае «максімум намаганняў для абслугоўвання абанентаў у зручнай для іх форме». Зараз створана беларуская версія сайта кампаніі, на якую зазірае 0,76 працэнта наведвальнікаў сайта.

«Мне падаецца, што ў кампаніі МТС вельмі добра і ветліва навучыліся пісаць адпіскі з заклікам іх не турбаваць і нічога ім не прапаноўваць. Маўляў, не назаляйце, мы вернемся да пытання самі ў 2010 годзе. Пасля гэтага складана ім нешта прапаноўваць і ад іх нешта патрабаваць. Акрамя таго, пытанне, хутчэй, не ў грошах. Спецыялісты кажуць, што гэта справа ў праграмным забеспячэнні, «беларусізаваць» якое — справа двух дзён. Хутчэй за ўсе, справа ў нежаданні гэтым займацца», — сказаў Койпіш.

**Паводле БелаПАН**

---

▸ СПРАВА

## КАНФІСКАВАЛІ МАЁМАСЦЬ РУХУ «ЗА СВАБОДУ»

**Судовыя выканаўцы канфіскавалі маёмасць з офіса грамадскай арганізацыі рух «За Свабоду».**


Photo.ByMedia.Net

Паводле слоў Аляксея Кавальца, які з'яўляецца арандатарам кватэры, дзе размешчаны офіс, была вынесена ўся маёмасць арганізацыі: кампутары, аргтэхніка, сталы, крэслы і нават кухонная мэбля, якая належыць гаспадыні кватэры.

Нагадаем, вечарам 18 лістапада 2008 года ў кватэру на праспекце Незалежнасці ў Мінску, якая была арандаваная арганізацыяй у якасці офісу, з'явіліся судовыя выканаўцы і апісалі маёмасць руху «За Свабоду». Гэта адбылося ў сувязі з тым, што сын гаспадыні кватэры Аляксандр Пыжкоў асуджаны па артыкуле «махлярства ў асабліва буйным памеры або ў змове з групай асобаў» і яго маёмасць падлягае канфіскацыі.

«З маёмасці, што належыць Пыжкову, у кватэры нічога няма. Усё належыць альбо мне, альбо маці асуджанага, якая здавала гэтую кватэру з 2001 года», — зазначыў Кавалец.

«Мы абскардзілі вопіс маёмасці ў судзе. Аднак суд пакінуў без увагі нашы доказы, паказанні сведак. Ён пакінуў без увагі нават тое, што тры гады таму судовыя выканаўцы ўжо прыходзілі ў кватэру. Але тады іх задаволіў адказ, што маёмасці сына ў кватэры няма. Мы зразумелі, што наступнае абскарджанне дарэмнае», — сказаў Кавалец.

**Паводле інфармацыі руху «За Свабоду»**

---

▸ ЗВАРОТ

## ПАЦЫЕНТЫ ЗВЯРНУЛІСЯ ДА МІНІСТЭРСТВА

**83 пацыенты Рэспубліканскай туберкулёзнай бальніцы «Волкавічы» (Дзяржынскі раён Мінскай вобласці) звярнуліся з адкрытым лістом у Міністэрства аховы здароўя Беларусі, у якім выказваюць незадаволенасць умовамі знаходжання ў гэтай медыцынскай установе.**

Пацыенты скардзяцца на няякаснае харчаванне, абмежаванне спатканняў, прымус хворых прыбіраць тэрыторыю бальніцы, калі ім пры гэтым даводзіцца паднімаць цяжкія прадметы, на адсутнасць тэлевізараў у палатах, бібліятэкі і гандлёвага кіёску на тэрыторыі ўстановы, а таксама на негуманнае стаўленне персаналу. Яны гатовы абвясціць галадоўку ў выпадку, калі сітуацыя ў бальніцы не зменіцца.

Як патлумачылі ў Міністэрстве аховы здароўя, каментуючы ліст пацыентаў, бальніца ў Волкавічах разлічана на 100 месцаў і з'яўляецца спецыялізаванай установай для прымусовага лячэння па рашэнні суда хворых на туберкулёз з Мінска і Мінскай вобласці. Прадстаўнікі міністэрства зазначылі, што пасля капітальнага рамонту, які скончыўся летась, туббальніца «Волкавічы» адпавядае рэжымным патрабаванням, што прад'яўляюцца МУС да ўстаноў падобнага тыпу. Тут ёсць ахова, кантрольна-прапускны пункт, спецыялізаваная агароджа па перыметры тэрыторыі, загароды на вокнах корпуса, дадатковае асвятленне тэрыторыі і г. д.

Медыцынскае забеспячэнне пацыентаў, забеспячэнне ахоўнага парадку, санітарна-гігіенічны рэжым і рэжым харчавання, як паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя, адпавядаюць у туббальніцы «Волкавічы» дзейным у Беларусі нарматывам. Сярэдні кошт пяцірazовага харчавання на дзень — 8098 рублёў, сярэдні кошт штодзённага лекавага забеспячэння — 6022,1 рубля, сярэдні кошт аднаго дня знаходжання ў гэтым стацыянары ў сярэднім за 2008 год склаў 83340 рублёў.

Наведванне пацыентаў туббальніцы «Волкавічы» сваякамі абмежавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі інфекцыйнага кантролю, а таксама для прадухілення перадачы алкагольных напояў, зазначылі ў Міністэрстве аховы здароўя. Бібліятэка і гандлёвы кіёск адсутнічаюць у адпаведнасці з патрабаваннямі захавання санітарна-гігіенічных і рэжымных умоў. У палатах няма тэлевізараў, паколькі з пункту гледжання бяспекі ў гэтым стацыянары ў палатах адсутнічаюць электрычныя разеткі.

Удзел пацыентаў пры ўмове адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў ва ўборцы тэрыторыі не супярэчыць прынцыпам працатэрапіі, заявілі ў Міністэрстве аховы здароўя.

У студзені 2008 года незадавальненне ўмовамі знаходжання ў клініцы выказалі каля ста пацыентаў туббальніцы ў гарадскім пасёлку Навасельня (Дзятлаўскі раён Гродзенскай вобласці) і абвясцілі галадоўку. Кіраўніцтва клінікі звязвала адмову пацыентаў ад ежы з тым, што ў бальніцы ўведзена поўная забарона на выхад хворых за тэрыторыю ў адпаведнасці з загадам Міністэрства аховы здароўя і ўнутраным распарадкам бальніцы.

**Паводле БелаПАН**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НІВОДНАЙ БУЛЬБІНЫ Ў РАСІЮ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Дагуляліся! Кіраўнік Расспажыўнагляду Генадзь Анішчанка заявіў у сераду, што не выключае змянення рэжыму свабоднага гандлю Расіі з Беларуссю для паставак усёй беларускай прадукцыі.**


Photo.ByMedia.Net

Фармальна раз'юшанасць Анішчанкі выклікала тое, што Беларусь рээкспартуе ў Расію віно і вінаматэрыялы забароненых малдаўскіх вытворцаў. «Ёсць падставы лічыць, што праз Беларусь у Расію ажыццяўляюцца пастаўкі віна і вінаматэрыялаў не дазволеных у Расіі малдаўскіх вытворцаў, а таксама пастаўкі гэтых вырабаў з іншых рэгіёнаў, на якія ў Расійскай Федэрацыі накладзена поўная забарона», — сказаў ён. Паводле яго слоў, пацвярджэнне інфармацыі аб рээкспарце «пацягне за сабой сур'ёзныя абмежавальныя меры і прэтэнзіі да беларускага боку».

Але не сакрэт, што сам спадар Анішчанка і ягоны Расспажыўнагляд даўно ўжо з'яўляюцца ніякім не «наглядам», а інструментам палітычнага ціску на краіны, якія чымсьці не спадабаліся Расіі. Расіі не спадабалася Малдова сваім імкненнем у Еўрасаюз — абмежавалі экспарт малдоўскіх вінаў. Не спадабалася Літва, — забаранілі экспарт шпротаў. Канфлікт з Грузіяй, — забаранілі экспарт грузінскага віна. Зараз не спадабалася Беларусь.

Адметна тое, што гэтая заяўка была агучана на наступны дзень пасля даволі рэзкіх выказванняў у бок Расіі Аляксандра Лукашэнкі падчас рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць 7 красавіка. Ён заявіў, што адмова Масквы выдзеліць Беларусі крэдыт у 100 мільярдаў рублёў сведчыць пра тое, што дзеянні Расіі не адпавядаюць прадэклараваным памкненням.

«Як можна выступаць з намерамі, каб валюта стала рэгіянальнай, а ў перспектыве, магчыма, і выйшла на ўзровень сусветнай (як амерыканскі долар або японская іена), і разам з тым не ісці практычна па гэтым шляху? — сказаў А. Лукашэнка. — Беларусь не зыходзіць у сваіх прапановах па крэдытах з таго, што мы нібыта хочам перахапіць яшчэ сотню мільярдаў рублёў. Гэта ў Расіі, напэўна, так хочуць гэта паказаць. Мы хочам, каб былі рэальныя крокі, якія б дазвалялі бачыць, што гэтыя працэсы насамрэч чагосьці вартыя». На думку прэзідэнта, расійскі бок пакуль не імкнецца ажыццяўляць практычныя дзеянняў у гэтым кірунку.

Беларускі прэзідэнт абвінаваціў расійскіх чыноўнікаў у невыкананні дамоўленасцей. «Што тычыцца Расіі, то тут назіраецца не зусім прыстойнае стаўленне. І я не баюся пра гэта публічна аб'явіць», — сказаў А. Лукашэнка. Ён абурыўся тым, што дасягнутыя на вышэйшым узроўні дамоўленасці зрываюцца або блакуюцца на ніжэйшых узроўнях, што стварае праблемы для нармальнага двухбаковага гандлю ў межах Саюзнай дзяржавы. «Мы дамовіліся, што будзем 150 долараў плаціць за газ. А потым прыязджаюць іншыя і кажуць: маўляў, не, малавата. Гэта значыць, тое, пра што дамаўляемся, не праходзіць. Расійскі бок нам таксама кажа: аддайце заводы, аддайце тое і гэта… Не, сёння ніхто ва ўмовах крызісу нічога задарма прадаваць не будзе», — заявіў прэзідэнт.

Вось і спрацаваў «ніжэйшы ўзровень» Анішчанкі...

Але з чым застанецца Расія, калі Анішчанка сапраўды выканае сваю пагрозу? Без грузінскага і малдоўскага віна і каньякоў, без літоўскіх да латвійскіх шпротаў яны ўжо засталіся. Застануцца без бульбы, беларускага малака ды смятаны, а таксама садавіны і гароднiны. Карацей, у выпадку такіх мераў у іх — ні чаркі ні шкваркі. Так што лепш бы спадар Анішчанка маўчаў.

> «Што тычыцца Расіі, то тут назіраецца не зусім прыстойнае стаўленне. І я не баюся пра гэта публічна аб'явіць», — сказаў А. Лукашэнка

А напярэдадні гэтага прэзідэнт Беларусі зусім нечакана прыняў адстаўку міністра ўнутраных спраў Уладзіміра Навумава. З афіцыйнай фармулёўкай «па стане здароўя». Потым сам жа Лукашэнка дадаў, што «чалавек знясілены, ён сапраўды стаміўся». «Навошта дабіваць чалавека на гэтай працы», — заўважыў прэзідэнт.

Канешне, як тут не стомішся! Навумаў абяцаў начэй не спаць, пакуль справа па выбуху ў Мінску 4 ліпеня мінулага года не будзе расследаваная. Дзевяць месяцаў прайшло, за гэты час можна было дзіцё нарадзіць, а следства, акрамя масавай дактыласкапіі насельніцтва, ні на міліметр не пасунулася. А Навумаў жа не спіць! Да таго ж, пешыя вандроўкі па-над Нараччу па сто кэмэ за 5 гадзін здароўя наўрад ці прыбаўляюць. Іншым разам здаецца, што лепш бы Навумаў піў і паліў, — менш бы здароўя страціў.

Але галоўнай падзеяй тыдня трэба прызнаць усё ж такі іншае. На гэтым тыдні, 6 красавіка, споўнілася 10 год з дня заўчаснай смерці выбітнага грамадскага і палітычнага дзеяча, былога дэпутата Вярхоўнага Савета Беларусі, былога мэра горада Генадзя Карпенкі.

7 красавіка ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры прайшла вечарына памяці Генадзя Карпенкі. У ёй узялі ўдзел сябры, калегі і паплечнікі палітыка, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса. Вяла вечарыну заслужаная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка.

Выступаючы перад прысутнымі, народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч зазначыў, што з Генадзем Карпенкам яны сябравалі і ў Маладзечне, і ў Мінску, у Вярхоўным Савеце. «Калі б у 1994 годзе кандыдатам у прэзідэнты стаў Генадзь Дзмітрыевіч, то ён меў бы рэальныя шансы стаць кіраўніком краіны, таму што валодаў усімі тымі якасцямі, якія патрэбны для заняцця гэтай высокай пасады. Яго любіў народ. Яго нельга было не любіць, — такога шчырага, добрага і адкрытага. Я не ўяўляю яго ў якасці бюракрата», — зазначыў Н. Гілевіч.

Ганаровы старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Станіслаў Багданкевіч расказаў пра сваю працу з Генадзем Карпенкам у Вярхоўным Савеце, у АГП і Нацыянальным выканаўчым камітэце — ценявым урадзе, створаным апазіцыяй. «Ён адбыўся як чалавек, ён быў вялікі грамадзянін Беларусі», — зазначыў С. Багданкевіч.

Успамінамі пра палітыка падзяліліся былы старшыня Вярхоўнага Савета Мечаслаў Грыб і паэт Уладзімір Някляеў, прысвечаную яму песню выканаў бард Алесь Камоцкі.

Падчас вечарыны памяці адбылася прэзентацыя кнігі «Генадзь Карпенка. Хроніка нязздзейсненых надзей» і дакументальнага фільма «Дзень «Ч», таксама прысвечанага Г. Карпенку.

А АГП у гэты дзень накіравала ў Маладзечанскі гарвыканкам заяву з просьбай надаць адной з новых вуліц імя Генадзя Карпенкі, які так шмат зрабіў для свайго горада.

Сапраўды, колькі я бачыў Генадзя Дзмітрыевіча, у яго на твары заўсёды была ўсмешка...

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### ЮОЗАС БУЛЬКА

Літоўская юстыцыя выдала еўрапейскі ордэр на арышт 83-гадовага каталіцкага святара з Беларусі Юозаса Булькі, які абвінавачваецца ў генацыдзе. Беларусь выдаць Літве ксяндза Бульку адмовілася, аргументаваўшы гэта неадпаведнасцю законам Беларусі.

Летась у кастрычніку літоўская пракуратура абвясціла вядомага ў Беларусі святара Юозаса Бульку ў еўрапейскі вышук. Літоўскія слугі Феміды абвінавачваюць Бульку ў тым, што на пачатку 1950-х гадоў ён супрацоўнічаў з камуністычнымі ўладамі, дапамагаў ім высочваць «лясных братоў», якія выступалі супраць савецкай улады, і мірных жыхароў, якія партызанам дапамагалі. Спачатку Юозас Булька змагаўся на баку «лясных братоў», а потым быў завербаваны органамі ГБ і супрацоўнічаў з імі як агент пад мянушкаю «Бімба». Пракуроры Літвы лічаць, што ксёндз Булька датычны да забойстваў 56 чалавек, якіх ён выдаў спецслужбам. Паводле літоўскіх законаў яму пагражае турэмнае зняволенне да 25 гадоў.

Ксёндз Юозас Булька атрымаў беларускае грамадзянства 10 гадоў таму. У вёсцы Мосар, дзе знаходзіцца яго прыход, святар карыстаецца вялікім аўтарытэтам, ён разгарнуў кампанію супраць алкагалізму, адкрыў музей барацьбы з п'янствам, помнік Яну Паўлу II. У 2006 годзе Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў ксяндза медалём Францыска Скарыны. Высунутыя супраць яго абвінавачванні святар абвяргае.

### ВІКТОРЫЯ АЗАРАНКА



Беларуская 19-гадовая тэнісістка Вікторыя Азаранка пасля перамогі на турніры ў Маямі паднялася на 4-е месца ў чэмпіёнскай гонцы Жаночай тэніснай асацыяцыі (WTA). Сёлета Вікторыя выйграла адразу тры турніры — у Брысбене, Мемфісе і Маямі. У абноўленым рэйтынг-лісце WTA Вікторыя Азаранка з 10-й пазіцыі паднялася на 8-ю. Першай ракеткай свету па-ранейшаму застаецца Серэна Уільмс, на другой прыступцы расіянка Дзінара Сафіна, на трэцяй — Алена Дзяменцьева.

«Мая мэта — стаць першай ракеткай свету. Гэта галоўны чыннік, чаму я гуляю ў тэніс, і я думаю, што мэта кожнага спартоўца — стаць нумарам адзін. Я не гавару, што гэта абавязкова адбудзецца, але я зраблю ўсё, што змагу», — заявіла Вікторыя Азаранка пасля перамогі ў Маямі.

### СЯРГЕЙ СІДОРСКІ



Надзвычайным клопатам пра спартыўную будучыню беларусаў вызначыўся прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі. Падчас сустрэчы з прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі хакея Рэне Фазелем ён паведаміў, што цягам бліжэйшых гадоў у Беларусі будзе пабудавана 12 новых крытых хакейных арэн — лядовых палацаў. «Напрыканцы года я ўзгадніў з прэзідэнтам будаўніцтва яшчэ 12 пляцовак у бліжэйшыя гады», — сказаў прэм'ер. Усяго плануецца пабудаваць 30 новых арэн, дадаў ён. Сідорскі адзначыў, што яшчэ некалькі гадоў таму ў Беларусі было 4 крытыя лядовыя арэны, цяпер іх ужо 13. Прэм'ер-міністр нагадаў, што беларуская зборная па хакеі з шайбай уваходзіць у дзесятку мацнейшых каманд свету, а дакладней, знаходзіцца на дзявятым месцы ў рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі хакея.

Падрыхтавала Вольга Хвоін

АДСТАЎКА

# ЧАМУ СЫШОЎ НАВУМАЎ

Генадзь КЕСНЕР

**Самай гучнай падзеяй апошніх дзён стала адстаўка міністра ўнутраных спраў Беларусі Уладзіміра Навумава. З афіцыйнай фармулёўкай — «па стане здароўя». Пакінуў адну з самых высокіх і адказных пасад у дзяржаве апошні старажыл — Уладзімір Навумаў ачольваў МУС амаль дзевяць год. Генерал быў апошняй публічнай і значнай дзяржаўнай асобай, якая знаходзілася ў «чорным спісе» аб'яднанай Еўропы з прычыны верагоднай прыналежнасці да знікненняў вядомых апанентаў дзеючай улады, у тым ліку і былога міністра ўнутраных спраў генерала Юрыя Захаранкі.**



Photo.ByMedia.Net

Яшчэ за некалькі дзён да адстаўкі, на прэс-канферэнцыі міністр выглядаў бадзёрым і здаровым, таму звязаную са станам здароўя версію мала хто ўспрыняў усур'ёз. Праўда, 7 красавіка, падчас паездкі па Гомельскай вобласці, кіраўнік дзяржавы заявіў, што Навумаў сышоў, бо «вельмі стаміўся». Сам жа міліцэйскі генерал паабяцаў назваць сапраўдныя прычыны сваёй адстаўкі «як-небудзь потым».

Не паверыў у фармулёўку «па стане здароўя» і палітолаг Аляксандр Класкоўскі. «Усе памятаюць, што міністр Навумаў праславіўся пешымі вандроўкамі вакол Нарачы, якія яскрава былі закліка괍ны прадэманстраваць яго жалезныя фізічныя кандыцыі. Пры аналізе гэтай сітуацыі на першы план выходзяць тыя аргументы, што ў кіраўніцтва краіны было больш чым дастаткова падстаў для незадаволенасці міністрам унутраных спраў. Гэта і леташняя гісторыя з выбухам на Дзень Незалежнасці, пасля чаго пачалася павальная дактыласкапія, і ўвогуле ведамства прадэманстравала цэлы букет сімптомаў, якія сведчаць пра поўную бездапаможнасць у расследаванні гэтай справы. Ды і калі ўзгадаць апошні час, то і гэта нашумелая гісторыя з самасудам над падпальнікам у палескай вёсцы. Адразу ўзнікае пытанне: а куды глядзела міліцыя, калі злачынца некалькі год трымаў у жаху цэлую вёску? Напрошваецца выснова, што сілавыя структуры, «заточаныя» сёння пад падаўленне іншадумства, не выконваюць сваю асноўную місію — абараняць грамадзян ад злачынцаў», — падкрэсліў эксперт.

Яшчэ «ў заслугі» беларускага МУС можна ўпісаць і такое ноу-хау, як «жывы шчыт», калі супрацоўнікі ДАІ літаральна падставілі машыны некалькіх мірных грамадзян, забараніўшы ім пакідаць свае аўто, пад аўтамабіль неадэкватнага рэцыдывіста Рамана Менцюка. У выніку пацярпелі ні ў чым не вінаватыя людзі, у тым ліку і малое дзіця. Тая гісторыя прагрымела на ўсю постсавецкую прастору.

Многія таксама памятаюць непасрэдны ўдзел Навумава ў разгонах мірных акцый апазіцыі, асабліва леташняй 25 сакавіка ў беларускай сталіцы, калі генерал (а гэта зафіксавалі многія фота -, відэа- і тэлекамеры) асабіста штурхаў у спіны «неаб'езджаных» на падобных мерапрыемствах спецназаўцаў з рэгіёнаў, каб тыя «хутчэй» разабраліся з баламутамі-маладафронтаўцамі на праспекце Незалежнасці. Менавіта пры міністры Навумаве колькасць затрыманых падчас вулічных акцый апазіцыі пачала складаць сотні ў год (праўда, апошнім часам гэтыя лічбы зменшыліся).

Магчымай прычынай сыходу Навумава Аляксандр Класкоўскі называе і барацьбу груповак у атачэнні кіраўніка дзяржавы, што супала з зацікаўленасцю афіцыйнага кіраўніка наладзіць стасункі з Еўропай. Навумаў быў апошнім з тых персаналій, якія фігуравалі ў вядомым дакладзе пра гучныя знікненні. Раней ужо былі адсунутыя ў цень Сівакоў, Шэйман, Паўлічэнка, зараз невядома, якую пасаду падбяруць Навумаву, але ён таксама, хутчэй за ўсё, застанецца ў ценю. Па меркаванню Класкоўскага, сёння, калі жыццёва неабходным робіцца калідор у Еўропу, такая адстаўка на руку Лукашэнку, таму што прыглушае нязручныя пытанні.

Былы міністр працы Беларусі Аляксандр Сасноў мяркуе, што Навумаў сам адчуў, што яму прыйшоў час пакінуць пасаду кіраўніка МУС. «Усіх грошай не заробіш. Ён зразумеў, што з той пасады, на якой ён знаходзіўся, ужо трэба ўцякаць. Я не думаю, што гэта «происки» нейкіх Віктараў ці яшчэ кагосьці, гэта проста спроба сысці ў цень, каб ніхто яго не бачыў, не ведаў, і пацішу дажываць», — лічыць Аляксандр Сасноў.

Экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі Аляксандр Казулін назваў эпоху Навумава «яжоўшчынай». А што да асобы былога міністра, то тут прафесар параіў уважліва пасачыць за тым, якія той даваў інтэрв'ю. «Калі ў чалавека спыталі, што ён чытае, і ён адказаў, што асіліў «Рабінзона Круза» і прыступіў да «Тарзана», гэта сведчыць пра ўзровень яго духоўнага развіцця, — кажа экс-рэктар Белдзяржуніверсітэта Аляксандр Казулін. — Калі ў яго запыталіся, якія ў яго любімыя святы, ён адказаў, што ў яго ўвогуле няма любімых святаў. Калі спыталі пра Новы год, ён адказаў, што прыходзіць дадому і кладзецца спаць. А як жа сям'я? Яго гэта не хвалюе. А як жа каханне? Ён сказаў, што пра гэта паняцце не задумваўся. Гэта вельмі дакладна характарызуе, які ён на самай справе і якія людзі амаль дзевяць гадоў узначальвалі адну з самых важных сістэм па абароне грамадзян. А сёння гэтая сістэма стала самай карумпіраванай».

Што да магчымай будучыні адстаўнога міністра, то тут варыянтаў не шмат. Палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі нагадвае, што Уладзімір Навумаў пакуль застаецца старшынёй Беларускай федэрацыі хакея. «Але хацеў бы заўважыць, што, калі кажуць пра магчымую дыпламатычную кар'еру Навумава, то яна можа быць звязана выключна з постсавецкай прасторай», — мяркуе эксперт. А Аляксандр Сасноў упэўнены, што Уладзімір Навумаў не пойдзе на якую-небудзь публічную і значную пасаду.

Да сённяшняга дня я не чуў ад кагосьці шкадавання па факту адстаўкі генерала Навумава з пасады галоўнага міліцыянта краіны. Прынамсі, ад апазіцыі добрых словаў на свой адрас экс-міністр, хутчэй за ўсё, не дачакаецца. Зараз цікава, хто стала зойме яго месца (асоб з пазнакай «в.а.» пакінем па-за ўвагаю). Галоўнае, каб горш не стала, бо калісьці грамадства, у тым ліку і журналісцкая супольнасць, меркавала, што ўжо горш, чым пры Кебічы, для дэмакратыі быць не можа.

ДАРУЧЭННЕ

# РАЗМЕЖАВАЦЬ ІНТАРЭСЫ

Вольга ХВОІН

**Аляксандр Лукашэнка пасля размовы са старшынёй Камітэта дзяржкантролю Зянонам Ломацем даручыў Савету міністраў распрацаваць праекты пунктаў пропуску на расійска-беларускай мяжы. Гэтыя захады прымаюцца для таго, каб усходняя мяжа адпавядала міжнародным стандартам. «Калі на знешняй мяжы Саюзнай дзяржавы пункты пропуску адпавядаюць міжнародным стандартам, то на мяжы з Расіяй сітуацыя патрабуе прыняцця неадкладных мер», — паведамляе прэс-служба Лукашэнкі.**

Пакуль што размова ідзе пра ўпарадкаванне інфраструктуры. На мяжы плануюць пабудаваць гатэлі, рэстараны, абсталяваць пункты абмену валюты. Уводзіць памежны кантроль на ўнутранай мяжы Саюзнай дзяржавы пакуль не збіраюцца. Начальнік прэс-цэнтра Дзяржаўнага памежнага камітэта Беларусі Аляксандр Цішчанка патлумачыў, што «кіраўнік дзяржавы праінфармаваны пра сітуацыю на пунктах пропуску на беларуска-расійскай мяжы. Калі на знешняй мяжы Саюзнай дзяржавы пункты пропуску адпавядаюць міжнародным стандартам, то на мяжы з Расіяй сітуацыя патрабуе прыняцця неадкладных мер. Савету міністраў даручана распрацаваць тыповыя праекты абсталявання пунктаў пропуску на беларуска-расійскай мяжы».

У пунктах пропуску будуць створаныя ўмовы для выканання мытных, страхавых задач, правядзення транспартнага і фітасанітарнага кантролю. Для гэтага, а таксама для зручнасці грамадзян, якія перасякаюць мяжу, патрабуецца адпаведная інфраструктура, зазначыў прадстаўнік Дзяржаўнага памежнага камітэта. «Задачы па ажыццяўленні памежнага кантролю не ставяцца», — цытуе БелаПАН словы Цішчанкі.

Цікава, што рашэнне арганізаваць пункты пропуску на мяжы з Расіяй з'явілася пасля таго, як Расія адмовіла Беларусі ў крэдыце на сто мільярдаў рублёў, якія меркавалася пусціць на ўзаемаразлікі ў расійскіх рублях. А на пачатку красавіка разгарэўся скандал з выключэннем з сеткі вяшчання шэрагу расійскіх тэлеканалаў.

Акрамя таго, падчас паездкі па Гомельскай вобласці Лукашэнка досыць рэзка выказаўся на адрас Расіі з нагоды невыканання дамоўленасцяў, якія датычыліся скасавання абмежаванняў ва ўзаемным гандлі. І калі Расія не хоча гандлёвых кантактаў са сваёй заходняй суседкай, то апошняя павінна шукаць іншыя рынкі збыту. Кіраўнік дзяржавы заявіў, што Расія паводзіць сябе несумленна і парушае дамоўленасці, патрабуючы больш грошай за газ. Паводле слоў Лукашэнкі, Расія ідзе на пэўны эканамічны шантаж: гандлёвыя палёгкі ўзамен на ўласнасць у Беларусі. Але ў цяперашніх умовах ніхто нічога прадаваць не будзе. «Трэба пацішу дывэрсіфікаваць экспарт і выходзіць на іншыя рынкі», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Палітолаг Віталь Сіліцкі лічыць, што загад арганізаваць пункты пропуску на беларуска-расійскай мяжы «хутчэй імпульсіўная заява, чым рэальны крок». «Магчыма, Лукашэнка вырашыў папужаць такім чынам Расію. Толькі практыка можа паказаць, ці гэта ўсё будзе рэалізоўвацца, — падкрэслівае эксперт. — Расія цяпер моцна прэсінгуе Лукашэнку за «Усходняе партнёрства», за адмову прызнаць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, за тое, што пачынае разварочваць свае лыжы на Захад. Для Лукашэнкі ж гэта звыклая тактыка шантажу, спроба падняць стаўкі. Я б назваў гэта прымусам да спонсарства. Сама па сабе мяжа ў трохстах кіламетрах ад Масквы вельмі знакавая для Расіі — як для палітыкаў, так і для грамадзян. І гэта моцна б'е па псіхіцы».

Разам з тым палітолаг лічыць, што для Беларусі наяўнасць выразна акрэсленых знешніх межаў — неабходны і нармальны складнік для здабыцця незалежнасці.

Кантроль на мяжы паміж дзвюма дзяржавамі не ажыццяўляецца з 1996 года. У 1995 годзе Беларусь і Расія падпісалі Дамову аб сумесных дзеяннях па ахове беларускай дзяржаўнай мяжы. У адпаведнасці з ім Беларусь узяла на сябе абавязальніцтвы забяспечваць інтарэсы Расіі на сваёй дзяржаўнай мяжы з Польшчай, Латвіяй, Літвой і Украінай, а Расія — ахоўваць свой участак знешняй мяжы Саюзнай дзяржавы.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# У ПРАВААБАРОНЦАЎ ЁСЦЬ ПЫТАННІ

Вольга ХВОІН

**Праваабаронцы звярнуліся да генеральнага пракурора Рыгора Васілевіча з адкрытым лістом, у якім патрабуюць вызваліць палітвязняў Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенку, а таксама надаць галоснасць ходу расследавання.**

З моманту затрымання жыхароў Ваўкавыска прайшло два месяцы, нядаўна следства было падоўжана яшчэ на адзін месяц — да 8 мая. Старшыня грамадскага аб'яднання «Прававая дапамога насельніцтву» Алег Волчак і старшыня арганізацыйнага камітэта па стварэнню рэспубліканскага грамадскага аб'яднання ветэранаў баявых дзеянняў «Абаронцы айчыны» Аляксандр Камароўскі ў адкрытым лісце звяртаюць увагу на тое, што інфармацыя пра ход расследавання справы, па якой былі затрыманыя Аўтуховіч, Лявонаў і Асіпенка, амаль адсутнічае.

«Мы ні ў якім разе не спрабуем умешвацца ў ход следства. Аднак даступная інфармацыя па справе выклікае шэраг сур'ёзных пытанняў», — гаворыцца ў лісце. Падпісанты ліста адзначаюць, што ваўкавыскія прадпрымальнікі абвінавачваюцца па артыкуле 218 Крымінальнага кодэкса ў падпале дома, які належаў былому начальніка Ваўкавыскага РАУС Кацубе і гаража супрацоўніка падатковай службы Мандзіка. Падпалы былі здзейсненыя ў 2005 годзе і справы былі расследаваны, «страты выплачаны, вінаватыя адбываюць пакаранне». Пацярпелыя ніякіх прэтэнзій да прадпрымальнікаў не маюць і заяў не пісалі. «Я гэтага Лявонава ў вочы не бачыў... Мне гэты бруд не патрэбны», — цытуюцца словы Кацубы. Аўтуховіча таксама абвінавачваюць у стварэнні злачыннай групы ў ліпені 2007 года, якая, па версіі абвінавачання, і здзейсніла падпалы ў 2005-м. Юрыю Лявонаву і Уладзіміру Асіпенку тыя ж дзеянні прад'яўляюцца не ў складзе групы. У ліпені 2007 года Мікалай Аўтуховіч знаходзіўся ў месцах пазбаўлення волі.

На афіцыйным сайце МУС 9 лютага была размешчаная інфармацыя пра затрыманні ў Ваўкавыску, без указання імёнаў, але зразумела, што гаворка ідзе пра затрыманых М. Аўтуховіча, Ю. Лявонава і У. Асіпенку. Там гаворыцца, што «яны падазраюцца ў здзяйсненні шэрагу цяжкіх злачынстваў, у тым ліку наўмысных падпалах і падрыву маёмасці, якая належыць службовым асобам Ваўкавыскага раёна, незаконным захоўванні выбуховых рэчываў і агнястрэльнай зброі…»



Photo.ByMedia.Net

«Афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі таксама падтрымліваюць «меркаванне», што абвінавачваныя захоўвалі выбуховыя рэчывы і зброя. Прыператрусах ні зброі, ні выбуховых рэчываў знойдзена не было. І вы, і мы, і любы грамадзянін нашай краіны, выдатна ведаем, што нават адной адзінкі зброі досыць для прад'яўлення абвінавачвання ў незаконным захоўванні. Аднак М. Аўтуховічу, Ю. Лявонаву і У. Асіпенку такое абвінавачванне прад'яўлена не было — паколькі нічога знойдзена не было, — падкрэсліваюць аўтары ліста. — Ствараецца ўражанне, што М. Аўтуховіч, Ю. Лявонаў і У. Асіпенка былі арыштаваныя без дастатковых на тое падстаў, паспешліва, па надуманым абвінавачванні ў падпале, і зараз ім спрабуюць інкрымінаваць хоць што-небудзь. Для гэтага і падаўжаецца следства і праз сродкі масавай інфармацыі гавораць пра цяжкасць злачынстваў — выбуховых рэчывах і зброі, нібыта знойдзеных у абвінавачваных, або звязаных з імі».

«Усё гэта выклікае пытанні і спараджае чуткі пра тое, што насамрэч грамадзяне Мікалай Аўтуховіч, Юрый Лявонаў і Уладзімір Асіпенка затрыманыя па палітычных матывах, — адзначаюць Алег Волчак і Аляксандр Камароўскі. — У прыватнасці, Мікалай Аўтуховіч за тое, што падпісаў адкрыты ліст прэзідэнту А. Лукашэнку, адмовіўшыся ад медалёў, прымеркаваных да 20-годдзя выводу Савецкіх войскаў з Афганістана, а таксама быў адным з удзельнікаў арганізацыйнага камітэта па стварэнні Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання ветэранаў баявых дзеянняў «Абаронцы айчыны». Выказваюцца і іншыя версіі, ніяк не звязаныя з крымінальным кодэксам».

Падпісанты ліста да генпракурора лічаць, што сітуацыя, якая склалася з названымі вязнямі, падрывае аўтарытэт і павагу да праваахоўных органаў. Відавочныя нестыкоўкі абвінавачвання, на жаль, ніяк не падвышаюць і давер да супрацоўнікаў гэтых органаў, а маўчанне і падаўжэнне следства толькі ўзмацняюць падазрэнні ў незаконным арышце. У сувязі з названымі акалічнасцямі справы Волчак і Камароўскі просяць праверыць законнасць арышту Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзімера Асіпенкі, а таксама разгледзець магчымасць замяніць арышт на падпіску аб нявыездзе. Аўтары ліста гатовыя ўзяць ваўкавыскіх вязняў на парукі пад сваю адказнасць.

Апошнімі днямі стала вядома, што па справе Аўтуховіча, Лявонава і Асіпенкі быў затрыманы слесар кампаніі «Сціф-Транс» Віктар Макуць. У доме і гаспадарчых пабудовах Макуця правяліператрус. У павеці міліцыянты знайшлі некалькі паляўнічых патронаў. Фірма «Сціф-Транс» займаецца грузаперавозкамі і арандавала памяшканне там жа, дзе працаваў Мікалай Аўтуховіч. Макуця ўжо дапытвалі па гэтай справе 8 лютага, цяпер супрацоўнікі праваахоўных органаў заявілі, што Макуць мае нейкую інфармацыю па следстве, цяпер ён знаходзіцца ў Мінску ў спецпрыёмніку-размеркавальніку на Акрэсціна.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ДАКТЫЛАСКАПІЯ З МАГЧЫМЫМІ НАСТУПСТВАМІ

Марыя КРУК

**Праваабаронцы заклікаюць абскарджваць неправамерныя дзеянні супрацоўнікаў МУС, якія датычацца масавай дактыласкапіі жыхароў Беларусі.**



Пасля выбуху 4 ліпеня цяпер ужо былы міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў для расследавання інцыдэнту выдаў распараджэнне №103 ад 26.08.2008 г. аб масавай дактыласкапіі ўсіх ваеннаабавязаных грамадзян ва ўзросце ад 18 да 55 гадоў. За дзевяць месяцаў павесткі ў міліцыю ці ваенкамат, атрымалі тысячы грамадзян, якім добраахвотна-прымусова прапаноўвалі «адкатаць пальчыкі».

Па звестках праваабаронцаў, гэта кампанія ахапіла як мінімум 20 буйных населеных пунктаў краіны. Было задзейнічана два асноўныя механізмы збору адбіткаў пальцаў: мужчын выклікалі ў ваенкамат, фармальна звяралі іх дадзеныя, пасля бралі адбіткі пальцаў, не ўтойваючы, што гэта звязана з выбухам 4 ліпеня. Выклікалі грамадзян і непасрэдна ў РУУСы. Тут ужо справа датычылася мужчын, жанчын, непаўналетніх. Бралі адбіткі пальцаў і ў былых супрацоўнікаў КДБ.

У пачатку студзеня прадстаўнікі Беларускага Хельсінскага камітэта звярнуліся да генеральнага пракурора Рыгора Васілевіча з просьбай абагульніць практыку разгляду скаргаў грамадзян на незаконныя дзеянні па дактыласкапіі і адмяніць распараджэнне Навумава як незаконнае. Крыху пазней старшыня Канстытуцыйнага суда Пётр Міклашэвіч заявіў, што падтрымлівае ініцыятыву, якая датычыцца дактыласкапіі ўсіх ваеннаабавязаных грамадзян рэспублікі. «Канстытуцыйны суд не бачыць парушэння канстытуцыйных правоў грамадзян пры правядзенні дактыласкапіі», — адзначыў старшыня Вярхоўнага суда.

«Мы лічым, што масавая дактыласкапія парушае канстытуцыйныя правы грамадзян, найперш права на недатыкальнасць асобы, права на асабістае жыццё, — гаворыць праваабаронца Алег Волчак. — Крымінальна-працэсуальны кодэкс дакладна акрэслівае, хто можа быць сведкам па справе: асоба, якая ведае інфармацыю, была сведкам ці відавочцам здарэння. Палова жыхароў краіны не можа праходзіць у якасці сведкі па гэтай справе. Для падобных следчых дзеянняў мусіць быць аператыўная інфармацыя, падставы».

Праваабаронца лічыць, што большасць людзей гэтыя позвы прыносяць маральны дыскамфорт. «Майму сябру, які жыве ў Германіі, таксама прыслалі на беларускі адрас позву. Яго гэта ўсхвалявала. Мы прызвычаіліся да такіх адносінаў да сябе, а ў цывілізаваным свеце гэта выклікае шок. Я прапаную пісаць скаргі на імя пракурора раёна, тым больш, калі на чалавека аказваецца ціск», — заяўляе Волчак.

У скарзе трэба напісаць, што вы не з'яўляецеся сведкамі і не хочаце здаваць адбіткі, пацікавіцца, на якой падставе вас далучылі да ліку сведак. Як правіла, тыя, хто піша падобныя скаргі, пазбаўляюцца настойлівых «запрашэнняў» прыйсці ў аддзяленні міліцыі і «здаць пальчыкі», да таго ж органы пракуратуры хоць неяк кантралююць дзеянні міліцыянтаў.

Праваабаронцы звяртаюць увагу, што большасць позваў аб дактыласкапіі афармляецца няправільна. На позве павінна стаяць пазнашча службовай асобы, пячатка, час, калі вас чакаюць у РУУСе, ваш статус і справа, па якой вы выклікаецеся. На няправільна афармленыя позвы можна не рэагаваць. Калі ж дакумент састаўлены правільна, то лепш прыйсці да следчага. Але кожны грамадзянін можа спаслацца на артыкул 60 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса і 27-ы артыкул Канстытуцыі і адмовіцца даваць паказанні датычна сябе, бо яны могуць быць выкарыстаныя ў далейшым супраць гэтай асобы.

Маральны дыскамфорт — не самае страшнае ў масавай дактыласкапіі. «Вы можаце патрапіць пад аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, — расказвае праваабаронца і былы следчы Алег Волчак. — Адбіткі пальцаў будуць у агульнай картатэцы, дзе імі могуць карыстацца любыя праваахоўныя органы. Любы следчы можа, спасылаючыся на Закон аб аператыўнай дзейнасці, паставіць на праслухоўванне, атрымаць доступ да карэспандэнцыі. Але самае страшнае будзе тады, калі на месцы нейкага злачынства знойдуць, напрыклад, паперку ад марозіва з вашымі адбіткамі пальцаў. Давядзецца апраўдвацца і тлумачыць, што і калі вы рабілі ў тым месцы».

ВІЗІТ

# Маціяс Плацэк: Я АБАВЯЗКОВА ЗНОЎ ПРЫЕДУ Ў БЕЛАРУСЬ

Генадзь КЕСНЕР

**6 красавіка ў Мінскім Міжнародным адукацыйным цэнтры імя Йоханеса Рау падчас сустрэчы з беларускімі і замежнымі журналістамі прэм'ер-міністр федэральнай зямлі Брандэнбург (Германія) Маціяс Плацэк падзяліўся сваімі ўражаннямі ад наведвання Беларусі і даў ацэнку працэсам, якія адбываюцца ва ўзаемадачыненнях паміж яб'яднанай Еўропай і афіцыйным Мінскам.**



Па словах спадара Плацэка, яшчэ ў нядзелю ўвечары (5 красавіка), у дзень прылёту ў Беларусь, адбылася цікавая дыскусія ўдзельнікаў нямецкай дэлегацыі з куратарыем Мінскага Міжнароднага адукацыйнага цэнтра наконт перспектыў яго далейшай дзейнасці. «Для мяне гэта вельмі важна, паколькі я пасля спадара Шнора буду ажыццяўляць патранат над гэтым цэнтрам, — адзначыў германскі палітык. — У панядзелак бізнесмены, што прыехалі разам з намі, правялі сумесны сняданак са спадаром Аўгусцінскім, які прадстаўляе інтарэсы нямецкай эканомікі ў Беларусі. Мы абмяркоўвалі магчымасці нашага ўдзелу ў беларускіх прадпрыемствах, магчымасці нашых інвестыцый у эканоміку Беларусі».

Пасля гэтага нямецкая дэлегацыя наведала сталічную школу № 41, якая мае цесныя партнёрскія стасункі з адной з гімназій зямлі Брандэнбург. «Мы сустрэліся з вучнямі, якія выдатна размаўляюць па-нямецку, нават без акцэнту, якія, да таго ж, выбітна граюць на мностве музычных інструментаў — нам прадэманстравалі нават цэлы аркестр, што вельмі ўразіла ўсю дэлегацыю. Апроч таго, мы з задавальненнем для сябе адзначылі, што настаўнік тут з'яўляецца паважанай і аўтарытэтнай асобай», — сказаў Маціяс Плацэк.

У афіцыйнай частцы візіту былі сустрэчы з прэм'ер-міністрам, міністрам замежных спраў і міністрам энергетыкі Беларусі. Па словах Маціяса Плацэка, нямецкаму боку ёсць што прапанаваць Беларусі ў пытаннях энергазабеспячэння, а менавіта, у галіне альтэрнатыўных крыніц энергіі. Да прыкладу, у зямлі Брандэнбург, якая паводле геаграфічнага становішча і метэаралагічных умоў вельмі падобная на Беларусь, штогод за кошт энергіі ветру вырабляецца 3800 мегават электраэнергіі, у той час як у Беларусі — усяго 1,1 мегавата. Сёння зямля Брандэнбург на 30 працэнтаў забяспечваецца энергіяй ветру, а ў 2020 годзе гэтая лічба мусіць дасягнуць адзнакі ў 90 працэнтаў. Таму пытанні сумеснай дзейнасці ў гэтай галіне абмяркоўваліся падчас усіх сустрэч, сказаў Маціяс Плацэк.

Адказваючы на пытанне нямецкага журналіста наконт таго, што не вельмі падабаецца прэм'ер-міністру зямлі Брандэнбург у Беларусі, Маціяс Плацэк адказаў: «Я па-іншаму ўяўляю сабе шматпартыйную дэмакратыю, чым тая, што ёсць у Беларусі. Што датычыцца сродкаў масавай інфармацыі, то можна адзначыць пэўны прагрэс у параўнанні з той сітуацыяй, якая мела месца два гады таму, але гэта не тая сітуацыя, не той узровень дэмакратыі, які я мог бы сабе пажадаць. Абодва гэтыя фактары дастаткова моцна ўплываюць і на правядзенне выбараў. Калі партыі не могуць разгарнуцца, і калі медыйная супольнасць мае абмежаваную прастору для сваёй дзейнасці, то і выбары, натуральна, не могуць адбывацца свабодна. Пра гэта пасля мінулай парламенцкай выбарчай кампаніі адкрыта заявіла АБСЕ. Але і ў гэтай галіне ідзе пэўнае набліжэнне да еўрапейскіх каштоўнасцяў, і гэта варта адзначыць».

Нямецкі палітык заявіў, што збіраецца наведаць Беларусь зноў, і выказаў спадзяванне, што да яго наступнага прыезду сюды сітуацыя, у тым ліку і са свабодай палітычных партый і масмедыя, палепшыцца, і на гэта павінен паўплываць удзел Беларусі ў праграме Еўрасаюза «Усходняе партнёрства».

«Яшчэ два гады таму мы не маглі сабе ўявіць, што з'явіцца праграма «Усходняе партнёрства», і з таго часу мы прасунуліся наперад. Я яшчэ два гады таму казаў, што Беларусь з'яўляецца часткаю Еўропы, і мы павінны крок за крокам ісці да таго, каб гэта стала сапраўднай рэчаіснасцю. Я заўжды прытрымліваўся меркавання, што ізаляцыя рэдка прыводзіць да прагрэсу. Канешне, бываюць сітуацыі, калі не застаецца нічога іншага, але варыянт ізаляцыі скрайне рэдка бывае прадуктыўным. Я лічу, што ўзаемаадносіны павінны быць такія, калі варта прымаць да ўвагі пункт гледжання партнёра, разумець, што ў яго могуць быць іншыя погляды, але пры гэтым нельга здраджваць уласным перакананням», — падкрэсліў прэм'ер-міністр федэральнай зямлі Брандэнбург Маціяс Плацэк.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# НЯМЕЦКА-БЕЛАРУСКІ ДЫСПУТ

Аляксей КАРОЛЬ

**6 красавіка ў вялікай залі Міжнароднага адукацыйнага цэнтра адбыўся 4-ы Дыспут памяці Йоханеса Рау «Рэгіянальнае супрацоўніцтва ў Еўропе».**

На гэты раз дыспут праходзіў у прынцыпова новай сітуацыі змены палітыкі ад канфрантацыі да дыялога паміж Еўрасаюзам і Беларуссю. На гэтым рабілі акцэнт усе выступоўцы, як бы перакідваючы масток ад двухбаковых нямецка-беларускіх дыспутаў да дыялога агульнаеўрапейскага. З лёгка чытальным падтэкстам: пачалі раней, прадбачылі раней, рыхтавалі глебу загадзя для змены стратэгіі, у патрэбны момант і пад гістарычна непазбежны збег абставін. І з адкрытым прызнаннем: так, дыялог ідзе з цяжкасцю, праз складанасці і адступленні, але іншага шляху няма.

З прывітальнымі словамі выступілі кіраўнік Міжнароднага адукацыйнага цэнтру з Дортмунда Маціяс Цюмпель, кіраўніца Мінскага цэнтру імя Йоханеса Рау доктар Астрыд Зам, прадстаўнік фонду імі Фрыдрыха Эберта Штэфан Хробат.

Фармальна з прывітальным, але па змесце канцэптуальным, дакладам выступіў амбасадар Германіі ў Беларусі доктар Гебхардт Вайс, нездарма яго тэкст быў распаўсюджаны яшчэ да пачатку дыспуту. Выступ жа амбасадара Беларусі Уладзіміра Скварцова, хаця і адзначаны ў многім не проста фармальнай рыторыкай пра карысць супрацоўніцтва, быў проста выступам. Што можна лічыць таксама знакам, дакладней азначэннем межаў дазволенага на гэтым нязвычным і вымушаным для беларускага рэжыму шляху дыялога.

Заяўлены раней у праграме выступ міністра замежных спраў Беларусі сп. Мартынава не адбыўся па прычыне яго адсутнасці. Па якой канкрэтна прычыне — невядома. Але відаць, што вельмі сур'ёзнай, бо менавіта міністр Мартынаў падчас свайго нядаўняга візіту ў Патсдам запрасіў у Мінск на дыспут прэм'ер-міністра зямлі Брандэнбург Маціяса Плацэка.

Прамаўляў сп. Плацэк у вольным стылі, без паперкі. Але па дакладнай і лагічнай вызначанай схеме, падпарадкаванай высвятленню асноўнай ідэі Йоханеса Рау — прымірэнне, а не раздзяленне — у кантэксце праблем усталявання і развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва. Яго мэтаў і магчымасцей, задач і вынікаў, форм і зместу. З апорай на ўласны вопыт на двух храналагічных узроўнях: спробах наладзіць рэгіянальнае супрацоўніцтва зямлі Брандэнбург з памежнымі рэгіёнамі Польшчы ў часы сацыялізму і пасля. Няўдалых на першым этапе і разнастайных, багатых на новыя формы і змест — на другім.

Гэтыя паралелі стварылі выдатны фон для асэнсавання сучаснага стану і магчымых перспектыў супрацоўніцтва зямлі Брандэнбург з Беларуссю. Добрасуседскія стасункі, правы чалавека і дэмакратыя, падкрэсліў Плацэк, з'яўляюцца канструктыўнымі элементамі для будучага Еўропы. Ён назваў шэраг ініцыятыў паміж Беларуссю і Брандэнбургам, якія ўжо ёсць у наяўнасці і якія патрабуюць развіцця. У прыватнасці, пабрацімскія адносіны паміж гарадамі, кантакты ў эканоміцы, энергетыцы і знешнім гандлі, парламенцкія кантакты, партнёрскія сувязі паміж школамі. Асобна адзначыў ён кантакты паміж грамадскімі ініцыятывамі Брандэнбурга і Беларусі, якія ўзніклі пасля аварыі на ядзерным рэактары ў Чарнобылі, паездкі беларускіх дзяцей да іх на аздараўленне.

MESSAGE

# ПРАМОВА АМБАСАДАРА ГЕБХАРДТА ВАЙСА

(са скарачэннямі)

…Часам бывае так, што візіты — як вехі, якія прымушаюць нас задумацца пра пройдзены шлях і пра новыя даляглялы. Калі ў кастрычніку 2007 года Вы, спадар прэм'ер-міністр (Маціяс Плацэк – рэд.), звярталіся да нас, перад намі стаяла палітычнае пытанне, ці здолеем мы распачаць новую старонку ў адносінах паміж Германіяй і Беларуссю, паміж Еўрасаюзам і Беларуссю.

Сёння Вы ўжо выступаеце перад намі на фоне прынцыпова новай фазы развіццz, якая хутка прывядзе Беларусь на «Усходняе партнёрства» Еўрасаюза. У адрозненні ад папярэдніх канцэпцый, у гэтым выпадку гаворка ідзе пра штосьці большае, чым толькі супрацоўніцтва Еўрасаюза з усімі сваімі краінамі-суседкамі. Зараз гаворка вядзецца ўжо пра новую якасць узаемадзеяння паміж Еўрасаюзам і яго еўрапейскімі суседзямі, уключна з Беларуссю, на двухбаковых і рэгіянальных асновах. Германія, якая на нашым кантыненце мае суседзяў больш, чым іншыя краіны, усведамляе адмысловае значэнне рэгіянальнага супрацоўніцтва, неабходнага для дабрабыту, якасці жыцця і бяспекі грамадзян.

Калі мы кажам пра наш досвед, мы таксама можам прапанаваць Мінску перспектыўныя ідэі і ініцыятывы. Таму, спадар прэм'ер-міністр, Вы тут з тэмай, якая цалкам адпавядае новай фазе развіцця ў Еўропе.



Разам з тым Вы тут у час, калі надзеі ў дачыненне да Беларусі, хаця і ўзрастаюць, але застаюцца пакуль не дастаткова стабільнымі і ўсё яшчэ змагаюцца са скептыцызмам, што грунтуецца на мінулым. Мы адчуваем гэта ў палітычных дыскусіях у Германіі, у Еўрасаюзе, але ў першую чаргу тут, у Беларусі. Таму цяпер надышоў час, калі толькі шляхам паслядоўных, станоўчых і канструктыўных захадаў усіх удзельнікаў гэты скептыцызм можна пазбавіць яго ўрадлівай глебы, і такім чынам надзеі могуць стаць упэўненасцю і — крок за крокам — рэальнасцю.

Гэты працэс перш за ўсё ў руках Беларусі і яе адказных эліт. Але істотна і тое, што ў дадзенай сітуацыі Германія і Еўрасаюз больш гатовыя да супрацоўніцтву, чым калі-небудзь раней. Пры гэтым гаворка ідзе не толькі пра пытанні еўрапейскай геаграфіі і яе палітычных і эканамічных наступстваў. Гаворка вядзецца таксама, у больш шырокім плане, пра палітычна мадэрнізаваную Еўропу, якая паўсюдна адпавядае годнасці ўсіх сваіх грамадзян.

Ёсць сігналы, што шлях туды і хуткасць руху Беларусь вызначыць самастойна ў рамках дэмакратызацыі і лібералізацыі. Для гэтага складанага працэсу ёсць новыя магчымасці, і яны запатрабуюць ад усіх нас не толькі новых адказаў, аднак і трывання. У першую чаргу запатрабуюць ад адказных эліт гэтай краіны — і ад уладных структур, і ад апазіцыйных. Але таксама і ў межах Еўрасаюза.

І тут мы маем гістарычныя арыенціры. Памятныя даты гэтага года скіроўваюць наш погляд таксама ў будучыню. Да іх належаць 65-годдзе вызвалення Мінска, а таксама падзенне Берлінскай сцяны 20 гадоў таму, — падзеі, якія ўяўляюць пэўныя фундаментальныя і спрадвечна еўрапейскія тэмы. У першую чаргу незалежнасць, правa, дэмакратыю і свабоду. Еўрапейская гісторыя заўсёды сведчыла: не трэба баяцца гэтых тэм, а толькі іх ворагаў. Гэта фундаментальныя тэмы, на аснове якіх у мінулым спадзяванні еўрапейскіх народаў заўсёды рабіліся рэальнасцю. На гэтым падмурку — а не дзякуючы найперш геаграфіі і эканоміцы — Беларусь вызначыць сваё годнае месца ў мадэрнізаванай Еўропе. На гэтай аснове «Усходняе партнёрства» можа прывесці да новай якасці Еўрапейскага Партнёрства. Гэтага я ад усяго сэрца жадаю вашай краіне.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 13 КРАСАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.35** «Зорныя танцы».
**11.00** Рамантычная меладрама «Оля + Коля» (Расія). 2-я серыя, заключная.
**12.10** Меладрама «Я вам больш не веру».
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Маё цудоўнае вяселле».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Прэм'ера. Серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна). 1-я серыя.
**18.50, 00.55** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.10** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**23.00** Трылер «Ідэальны сябар» (Францыя).
**01.00** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**10.40** Мультфільм. «Шапакляк».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.05** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Песні маёй краіны».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**19.05** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера АНТ : «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**22.20** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.05** Нашы навіны.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Зваротны адлік». «Армія Краёва. Свае і чужыя».
**23.55** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**00.40** Нашы навіны.
**01.55** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** Фільм «Трое і сняжынка». 2007 г.
**15.10** «Прыватныя гісторыі».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Спартыўны тыдзень».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Багатая і каханая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Жорсткасць». Расія, 2007 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Гучная справа».

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Тэлебарометр.
**08.45** Усё аб бяспецы.
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.00** Кінараман «Цыган» (СССР). 1-я серыя.
**12.45** Гаспадар.
**13.15** Вострасюжэтны серыял «Канец свету» (Расія). 1-я серыя.
**14.10** Бухта капітанаў.
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Таемны густ.
**15.35** Экспедыцыя.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Экспедыцыя.
**21.20** Камедыя становішчаў «Вялікі бізнэс» (ЗША).
**23.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**00.10** Хакей. Формула гульні.

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.30** «Гарадок».
**10.30** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.25** Пакой смеху.
**12.40** Фільм «Апошні жулік». 1966 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Фуэтэ даўжынёю ў жыццё...». Дакументальны фільм.
**15.50** «Віват, Акадэмія!». Дак. фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Сумленны дэтэктыў».
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Бос», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлесерыял «Калі яе зусім не чакаеш», 2007 г.
**21.30** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**22.35** «Кулагін і партнёры».
**23.10** «Весткі+».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Рыгор Бальшакоў. Вялікі спявак Вялікага тэатра». Дакументальны фільм.
**00.30** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**15.05** Проста цырк.
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Прэм'ера. Камедыйны серыял «Нацыянальны здабытак».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.35** «Сумленны панядзелак».
**22.35** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.00** Сёння.
**23.25** Вострасюжэтны серыял «Зваротны адлік».
**00.15** «Школа зласлоўя».

EUROSPORT

**09.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 105 кг.
**10.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. +105 кг.
**12.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Канадзе. Мужчыны. Фінал.
**14.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. +105 кг.
**15.00** Веласпорт. Велагонка Парыж - Рубэ.
**16.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. +105 кг.
**17.45** Снукер - зала славы.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Еўрагалы.
**20.00** Вось дык так!!!
**21.30** Армрэстлінг. PAL/NAL.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
**00.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**01.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. +105 кг.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Серыял «Ранча».
**19.00** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Курганы».
**19.05** Канцэрт «Салідарныя з Беларуссю». Ч. 2
**19.55** Дак. фільм «Восем месцаў. Вандроўка ў Афганістан». ЗША, 2006 г.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Гумарыстычная праграма «Жаўтуха».
**21.45** Маст. фільм «Вясельныя клопаты». ЗША–Германія, 2001 г.
**23.25** Тэлесерыял «Элі Макбіл».
**00.10** Аб'ектыў.

## 14 КРАСАВІКА, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.50** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна). 1-я серыя.
**11.40** Відэафільм АТН «Смаргонскія меладыі» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**13.05** Камедыйны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Капкан» (Расія).
**16.55** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна). 2-я серыя.
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1\4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.45** Дзень спорту.
**00.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1\4 фіналу.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Чакай мяне».
**10.05** «Халодная вайна Мікіты Хрушчова».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера АНТ: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**22.20** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.05** Нашы навіны.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Геніі і злыдні».
**23.55** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**00.40** Нашы навіны.
**00.55** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Жорсткасць». Расія, 2007 г.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Багатая і каханая». Серыял. Заключная серыя.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Майстар і Маргарыта». Серыял. Заключная серыя.
**21.40** «Аўтапанарама».
**22.00** «Вайна. Вядомая і невядомая». «Фронт за лініяй фронту». Фільм другі.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.00** «Надзвычайныя гісторыі».

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**11.50** Хакей. Формула гульні.
**12.20** Кінараман «Цыган» (СССР). 2-я серыя.
**13.40** Вострасюжэтны серыял «Канец свету» (Расія). 2-я серыя.
**14.40** Мультсерыял «Аладзін» (ЗША).
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Бітва экстрасэнсаў.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Экспедыцыя.
**21.20** Спорт-кадр.
**21.50** Фантастычны трылер «Знакі» (ЗША).
**23.50** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.10** Тэлесерыял «Калі яе зусім не чакаеш».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**12.30** Фільм «Першы рэйс». 1976 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «...Каб кожны радок пражыць сабой...». Дакументальны фільм.
**15.50** «І да, і пасля цябе будуць іграць тую ж ролю...». Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Падарожжы музыкі».
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Бос», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлесерыял «Калі яе зусім не чакаеш», 2007 г.
**21.30** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**22.35** «Кулагін і партнёры».
**23.10** «Весткі+».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Пад маскай жартаўніка». Дак. фільм.
**00.30** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**06.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Жаночы погляд».
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Залатыя хлопцы».
**12.10** Серыял «Зваротны адлік».
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**15.05** Проста цырк.
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Камедыйны серыял «Нацыянальны здабытак».
**18.10** «Ты не паверыш! Ньюс».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.35** «Вочная стаўка».
**22.35** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.00** Сёння.
**23.25** Вострасюжэтны серыял «Зваротны адлік».

EUROSPORT

**09.30** «Алімпійскія гульні». Тэлечасопіс.
**10.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.45** Веласпорт. Велагонка Парыж - Рубэ.
**12.00** Снукер - зала славы.
**13.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**14.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы.
**15.15** Вось дык так!!!
**15.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы.
**16.30** Футбол. Еўрагалы.
**16.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Першыя матчы.
**18.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. 105 кг.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Вось дык так!!!
**19.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. +105 кг.
**20.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.00** Бокс. Міжнародны паядынак у Вялікабрытаніі (Лондан).
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна Еўропы ў Германіі.
**00.00** Аўтагонкі. Сусветная серыя (Рэно). Агляд сезону.
**00.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Румыніі. Мужчыны. +105 кг.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Тэлесерыял «Элі Макбіл».
**19.00** Дак. фільм «Восем месцаў. Вандроўка ў Афганістан». ЗША, 2006 г.
**20.00** Музычная праграма «Кухня».
**20.20** Асабісты капітал.
**20.40** Паштоўка з Вільні.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Маю права.
**21.35** Еўропа сёння.
**22.05** Госць «Белсату».
**22.25** Сальда.
**22.45** Тэлесерыял «Элі Макбіл».
**23.30** YoLife!
**00.00** Аб'ектыў.

## 19 КРАСАВІКА, НЯДЗЕЛЯ

**06.45** Прыгодніцкі серыял «У пошуках капітана Гранта» (СССР).
**07.55** Альманах вандраванняў.
**08.20** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Ўваскрэсення Хрыстова.
**08.30** Існасць.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**09.20, 12.10** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.25** Арсенал.
**09.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках «Формула-1». Гран-пры Кітая. Гонка. Прамая трансляцыя.
**12.15** Культурныя людзі.
**12.50** У свеце матораў.
**13.25** Героіка-прыгодніцкі фільм «Карона Расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя» (СССР). 2-я серыя.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Nota Bene.
**16.00** КВЗ. Кубак Еўралігі.
**17.55** Суперлато.
**18.55** «Зорныя танцы».
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.10** «Відэафільм АТН «Зямля беларуская»: за кадрам».
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**23.05** Меладрама «Падмаскоўная элегія» (Расія). 1-я і 2-я серыі.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.50** «Шалапутныя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** «Разумніцы і разумнікі».
**12.20** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**13.05** «Зваротны адлік». «Армія Краёва. Свае і чужыя».
**13.35** Камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Гісторыя аднаго цуду».
**16.50** Фільм «Прынцы паветра». ЗША, 2006 год.
**18.25** Прэм'ера АНТ: «Песні маёй краіны».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Меладрама «Тыгр і снегапад». Італія, 2005 год.
**23.45** «Што? Дзе? Калі?».

**06.55** «Праверана на сабе».
**07.40** «Вовачка - 4». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм «Нас двое». Францыя, 2008 г.
**09.30** «Добры дзень, доктар!».
**10.00** «Святыні Беларусі».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Аўтапанарама».
**13.00** Фільм «Калі ты мяне чуеш». Расія, 2007 г.
**14.40** «Дарагая перадача».
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Уваскрэсенне класікі. Дыялогі аб музыцы.
**18.00** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Слухаючы цішыню». Расія, 2007 г.
**22.20** «Спартыўны тыдзень».
**22.40** «Прафесійны бокс».
**23.25** «Агенцтва «Залатая куля». Серыял.

**08.10** Дабравест.
**08.40** Мір вашай хаце.
**08.50** Бухта капітанаў.
**09.30** Наша пяцёрачка.
**10.00** Мультфільм.
**10.20** Фантастычны серыял «Прыгоды Электроніка» (СССР).
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.10** Сезон поспеху.
**12.50** Пасоўванне+.
**13.05** Слова пісьменніка.
**13.35** «Беларускі народныя каляндар. Вялікдзень». Відэафільм («Белвідэацэнтр»).
**13.50** Дэтэктыўны серыял «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Фільм «Скарбы Агры» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**16.35** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці» (ЗША).
**18.15** Прэм'ера. Сямейная меладрама «Крылы анёла» (Украіна). 1-я і 2-я серыі.
**20.25** Тэлебарометр.
**20.45** «Правы чалавека».
**21.00** Экспедыцыя.
**21.30** Іранічная меладрама «З каханнем, Ліля» (Расія).
**23.30** Свая музыка.
**00.00** Пасоўванне +.

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Шматсерыйны фільм «Міхайла Ламаносаў». «Брама вучонасці». 1986 г.
**10.00** «Смехапанарама» Яўгенія Петрасяна.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «Як стаць шчаслівым». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Вяртанне Турэцкага». Фільм 4 «Журавіны», серыя 2.
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «Верыш, не верыш». 1971 г.
**15.50** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон-2009.
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.25** КВЗ. Першая ліга. 1/8 Фіналу.
**22.15** Фільм «Востраў». 2006 г.
**00.55** Заканчэнне эфіру.

**07.30** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.25** Выратавальнікі.
**10.55** «Прафесія-рэпарцёр».
**11.25** «Авіятары».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.10** Фантастычныя прыгоды «Бібліятэкар-2. Вяртанне ў капальні цара Саламона».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Барацьба за ўласнасць».
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**19.50** Прэм'ера. «Ала Пугачова: Прызнанні жанчыны, якая спявае».
**21.00** «Галоўны герой».
**22.15** «Рускія не здаюцца!».
**22.50** Вострасюжэтная сацыяльная драма «Алігарх».
**01.00** «Футбольная ноч».

**09.30** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 1-ы дзень.
**11.00** Матагонкі. Гонкі «24 гадзіны Ле Мана» (Францыя). Прамая трансляцыя.
**12.15** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. 2-і дзень. Прамая трансляцыя.
**14.00** Аўтагонкі. Сусветная серыя (Рэно) у Іспаніі (Барселона). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
**15.00** Матагонкі. Гонкі «24 гадзіны Ле Мана» (Францыя). Прамая трансляцыя.
**16.15** Веласпорт. Велагонка Amstel Gold. Прамая трансляцыя.
**18.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 2-і дзень. Прамая трансляцыя.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Чарльстан). 1/2 фіналу.
**20.15** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Чарльстан). Фінал. Прамая трансляцыя.
**22.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 2-і дзень. Прамая трансляцыя.
**00.00** Мотаспорт па выходных.
**00.15** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі IBF у ЗША.
**02.15** Мотаспорт па выходных.

**18.00** Прэс-экспрэс.
**18.15** Серыял «Ранча».
**19.10** Канцэрт царкоўнай музыкі. Ч. 2.
**19.35** Дак. фільм «Ваўчыная маці». Польшча, 2007 г.
**20.05** Ток-шоу «Форум».
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Хрысціянства».
**21.25** Маст. фільм «Жэлары». Чэхія–Славакія–Аўстрыя), 2003 г.
**23.50** Мультсерыял «Бульбаны».
**00.00** Аб'ектыў.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________
(по реестру ф. 11)
№ ____________
(по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.
(сумма прописью)

Кому / Куда: Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________

Адрес ____________
(почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ____
Всего ____

Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ____
Всего ____

Кассир

ЦІКАВА

# ТАЙНА ТРЭЦЯЙ СТАЛІЦЫ

Іван БІЧ

**Вялікі інфармацыйны рэзананс, нефармальнае спаборніцтва паміж буйнымі гарадамі, парад мясцовага патрыятызму, шавіністычныя настроі супраць татар, цікавасць да гісторыі, выбух жартаў і шмат чаго яшчэ выклікала ў Расіі рашэнне прызнаць Казань трэцяй сталіцай дзяржавы. Прапануем вашай увазе падборку каментараў з расійскіх блогаў на гэтую тэму.**

— Куршавэль, папулярны сярод алігархаў курорт, — наша сапраўдная трэцяя сталіца.

— Сталіцы Расіі: Ноўгарад (862–881), Кіеў (881–1151), Уладзімір (1157–1328), Масква (1328–1712), Санкт-Пецярбург (1712–1728), Масква (1728–1730), Санкт-Пецярбург/Петраград (1730–1918), Масква (з 1918). Дзе ў гэтым шэрагу Казань, каб быць трэцяй сталіцай? На якой падставе? Дэмаграфія? У такім выпадку Новасібірск, Ніжні Ноўгарад, Екацярынбург. Гісторыя? У такім выпадку Уладзімір, Ноўгарад. Узровень развіцця? Тады Екацярынбург або Сочы. Чаму Казань?

— Улады Казані зарэгістравалі за сабой таварны знак «Казань — трэцяя сталіца Расіі». Я жыву ў Піцеры, і заўсёды смяюся, калі нашы ўлады насаджаюць «культурную сталіцу». Намаганне давесці, што мы не лыкам шытыя, — гэта і ёсць асаблівасць правінцыялаў. Слова «культура» — не толькі Марыінскі тэатр з балетам, які наперадзе планеты ўсёй. Мне соромна, калі ўсе вуліцы пакрытыя вялікімі дзіркамі, большымі, чым магла зрабіць авіяцыйная бомба, каналы засыпаныя банкамі і пляшкамі, а скверы — сабачымі мінамі. Разумееш, што выключна еўрапейскі такт і адукацыя прымушаюць замежнікаў задраць вочы да шпілю Адміралцейства і пацокаць языком: «Ах, якая архітэктура!» Трэба аддаць належнае казанцам: яны ўсіх пераплюнулі, зарэгістраваўшы свой пафас.





## Даведка:

У 2007 годзе камітэтам эканамічнага развіцця Казані ў Федэральную службу абароны інтэлектуальнай маёмасці, патэнтаў і таварных знакаў («Роспатент») была пададзена заяўка на рэгістрацыю таварнага знаку «Трэцяя сталіца Расіі». На мінулым тыдні яна была задаволеная.

Гэтаму рашэнню папярэднічала вайна Казані і Ніжняга Ноўгараду за «бронзу». Два гады таму віцэ-губернатар Ніжагародскай вобласці пагражала Казані іскам за самавольнае прысваенне назвы «Трэцяя сталіца Расіі». Яна пабачыла такі надпіс падчас адной з выстаў у Берліне. Казанцы ў адказ заявілі, што «трэцяй сталіцай» іх горад назваў не хто іншы, як сам Уладзімір Пуцін, які прымаў удзел у святкаванні тысячагоддзя сталіцы Татарстану. Тады адміністрацыя Ніжняга Ноўгарада кінулася ў «Роспатент», аднак казанцы іх апярэдзілі.

Казань — адзін з самых буйных гарадоў Расійскай Федэрацыі. Горад мае тысячагадовую гісторыю. Займае трэцяе месца ў Расіі па памерах інвестыцый у асноўны капітал. Летась Казань атрымала права на правядзенне ў 2013 годзе Сусветнай летняй універсіяды.



— Чаму не Омск? Дарэчы, Омск у часы грамадзянскай вайны быў сталіцай дырэкторыі Калчака і быў прызнаны сталіцай Расіі шэрагам еўрапейскіх дзяржаў.

— Мяркую, што ўсе гарады пасля Масквы павінны быць перайменаваны ў сталіцы Расіі з улікам колькасці насельніцтва, прыкладна так: «Ржэў — 328-я сталіца Расіі». Таксама прапаную ўвесці закон пра адказнасць за «адмаўленне сталічнасці» кожнага горада ў Расіі.

— Ды якая трэцяя сталіца Расіі — Казань?! Няўжо яны дурныя? Трэцяя сталіца — Свярдлоўск.

— Назваліся б лепш першай сталіцай Казанскага ханства — куды больш арыстакратычнасці.

— Сталіца Татарстану замарочылася і зарэгістравала патэнт на назву «Трэцяя сталіца Расіі». Адзнака нашай эпохі — назву цяпер можа проста набыць і пасля скакаць ад радасці. Ура! Усіх надурылі!

— Ва ўсіх крутых краінах таксама па некалькі сталіц. Філіпіны — Маніла і Кесон, Малайзія — Куалу і Лумпур, Балівія — Ла-Пас і Сукрэ, Нідэрланды — Гаага і Амстэрдам. Але мы аказаліся круцей: у нас тры сталіцы!

— Я, натуральна, рада за Казань, аднак што зменіцца пасля таго, як горад атрымае гэты тытул? Уздымуцца эканамічныя паказчыкі? Наадварот, Екацярынбург, Самара, Ніжні Ноўгарад і Новасібірск дружна пакрыўдзяцца на сталіцу Татарстану.

— Магу адназначна сказаць, што нічога ні самой Казані, ні яе жыхарам не свеціць. Гэта так жа смешна, як называць нашу краіну дэмакратычнай і казаць, што мы жывём па прынцыпах грамадзянскай супольнасці, называць насельніцтва еўрапейцамі.

— Федэральнай службе па інтэлектуальнай маёмасці, патэнтах і таварных знаках трэба рабіць справаздачу перад урадам, атрымаць «бабло», зляцець у Куршавель. А пасля адпачынку зноў падумаць ужо пра чацвёртую сталіцу.

— Дзіўная навіна. Горад, у якім дзесяць гадоў на афіцыйным узроўні змагаюцца з рускім духам (і трэба прызнаць, змагаюцца паспяхова), цяпер прызнаны трэцяй сталіцай дзяржавы. Не разумею, шчыра кажучы. Магчыма, гэта нейкі стратэгічны ход, які павінен захаваць Казань і ўвесь рэгіён у складзе Расіі. Маю надзею, што пасля такога рашэння паўзучая татарызацыя шматнацыянальнага гораду прыпыніцца. З іншага боку — не факт. Сталічны комплекс казанскіх уладаў становіцца відавочным, калі паглядзець або паслухаць мясцовыя навіны: «надвор'е ў сталіцы», «у сталіцу з візітам», «сталічныя ўлады». Цяпер можна выдаваць у эфіры падобныя нумары.

— Дарэчы, сярод праектаў Івана Грознага сапраўды была ідэя пераносу сталіцы спачатку ў Волагду, а потым далей на ўсход — у Казань.

— У 1612 годзе пры польскай акупацыі Масквы ў Смутны час фактычнай сталіцай быў Яраслаўль, дзе быў створаны часовы ўрад (Савет усёй зямлі).

— На што толькі ў нашай дзяржаве грошы не марнуюць. Лепш давалі б квоты дзецям на анкалагічнае лячэнне.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

У адрозненні ад Расіі, якая мае 385 мільярдаў долараў у грашовых рэзервах, Беларусь адчайна намагаецца пазбегнуць банкруцтва, хаця з 2000 года тэмпы росту яе гаспадаркі стабільна складалі ў сярэднім восем працэнтаў. У краіны засталося чатыры месяцы, каб дастаць дадатковыя грошы на Захадзе або атрымаць фінансаванне з Масквы… Беларусь важная для Расіі з-за свайго геапалітычнага становішча, і таму ёй будзе цяжка супрацьстаяць расійскаму ціску, — адзначае амерыканская кампанія па аналізу рызыкаў Stratfor. Расійская фінансавая дапамога вельмі важная для эканомікі Беларусі, якая знаходзіцца ў ізаляцыі, каб адмовіцца ад яе ва ўмовах эканамічнага крызісу. Такую ацэнку група Stratfor прапанавала сваім кліентам у мінулым месяцы.

**«YZLE» (Расія)**

Што б ні рабілі беларускія палітыкі, якія намагаюцца зберагчы сваю ўладу і пры гэтым заставацца добрымі для ўсіх — як кажуць, і рыбку з'есці і яшчэ кудысьці сесці, — перспектыва стварэння Саюзнай дзяржавы ўсё роўна застаецца. Ніхто і нішто не зможа перашкодзіць стварэнню гэтага саюза. Расія ў любым выпадку павінна абараняць свае інтарэсы ў дыялогу з Беларуссю. Як у кожнай сям'і, дзе дзеці адных бацькоў маюць розныя погляды, мы абавязаныя абараняць свае інтарэсы, аднак пры гэтым намагацца шукаць кампраміс. Галоўнае тут — не пароць гарачку і сыходзіць з агульнанацыянальных інтарэсаў.

**«Trelili.ru» (Расія)**

Знешнія запазычанасці Беларусі растуць хуткімі тэмпамі, і ўжо ў наступным годзе іх абслугоўванне можа каштаваць 6 мільярдаў долараў. На фоне глыбокага адмоўнага знешнегандлёвага сальда (рост у студзені — лютым у параўнанні з мінулым годам да 1 мільярда долараў) і падзення экспарту на 50 працэнтаў, рост памераў запазычанасці можа каштаваць Беларусі незалежнасці, у першую чаргу фінансавай.

**«Независимая газета» (Расія)**

Нават калі расійскі бок падчас перамоваў здолее прывязаць крэдыт для Беларусі да нейкіх палітычных патрабаванняў, не відавочна, што гэта можна лічыць поспехам. Наконт рашэння па прызнанню Абхазіі і Паўднёвай Асеціі Аляксандр Лукашэнка можа цягнуць да тых часоў, калі ўжо будуць існаваць нейкія перспектывы паляпшэння адносін з Еўрасаюзам. Акрамя таго, аднойчы абмяняўшы прызнанне на крэдыт, Масква наўрад ці зможа дабіцца, каб нехта яшчэ прызнаў Абхазію і Паўднёвую Асецію бясплатна.

**«Эксперт» (Украіна)**

Беларусь, якой кіруе Аляксандр Лукашэнка, служыць Расіі буферам на еўрапейскім накірунку і маршрутам транзіту газу на Захад. У мінулым годзе яна дабілася атрымання крэдыту ў 1,5 мільярда долараў, пагадзіўшыся прадаць «Газпраму» частку сваёй трубаправоднай сістэмы і стварыць разам з Расіяй сістэму супрацьракетнай абароны.

**«Financial Times» (Вялікабрытанія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ



### ВЕНЕСУЭЛА. АРЫШТАВАНЫ БЫЛЫ МІНІСТР

Судовыя органы краіны нечакана пачалі юрыдычны пераслед лідэраў апазіцыі. У мінулы чацвер у сваім доме агентамі вайсковай паліцыі быў арыштаваны Рауль Бадуэль, былы міністр абароны. Праз некалькі гадзін старшыня вайсковай пракуратуры прызнаў, што Бадуэль знаходзіцца за кратамі. Ён таксама паабяцаў, што на працягу 30 дзён яму будзе прад'яўлена абвінавачанне. Бадуэль ужо быў у турме ў мінулым годзе. Каб выйсці на волю, яму давялося заплаціць залог у памеры 10 мільёнаў еўра. Да 2007 года Бадуэль аддана служыў Чавесу. Больш таго, менавіта дзякуючы яму падчас путчу 2002 года Уга застаўся пры ўладзе. Аднак пасля таго, як Чавес захацеў пераабірацца на пасаду прэзідэнта неабмежаваную колькасць разоў, іх адносіны сапсаваліся. Пасля сыходу ў апазіцыю Бадуэль спрабаваў стварыць сабе імідж лідэра «новай апазіцыі», якая выступае супраць Чавеса і адначасова супраць дэмакратаў, якіх падтрымлівае ЗША.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### ГЕРМАНІЯ. БУНТ МАЛАДЫХ ЛІБЕРАЛАЎ

Скандал у асяроддзі моладзевай арганізацыі Партыі вольных дэмакратаў (FDP) — самай буйной ліберальнай партыі ФРГ. Нечакана яе лідэры Рослер і Лінднер запатрабавалі, каб у будучай праграме партыі фігуравалі такія левыя словы, як «салідарнасць», «справядлівасць» і нават «сацыяльная справядлівасць». Фронда моладзі (адзін з ініцыятараў лічыцца галоўным кандыдатам на пасаду старшыні) выклікала шок у старэйшай генерацыі партыі і яе старшыні Гвіда Вестэрвеле. Апошні з пачатку цяперашняга крызісу займаў паслядоўную ліберальную пазіцыю: выступаў супраць таго, каб канцэрн Opel, які знаходзіцца на парозе банкруцтва, атрымаў дзяржаўную дапамогу, не прыняў ідэю кантролю дзяржавы над прыватнымі банкамі і назваў «грэхам» адказ ад прынцыпаў свабоднага рынку. Эксперты лічаць, што левыя забабоны маладых лібералаў выкліканыя модай сярод нямецкай моладзі на Барака Абаму. Апошні, як вядома, выступае за больш кантроль дзяржавы над эканомікай.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### ФРАНЦЫЯ. САРКАЗІ ПАПЛАЦІЎСЯ ЗА ТОЕ, ШТО НЕ ЛЮБІЦЬ КЛАСІКУ

Цікавую падставу для атакі на Нікаля Сарказі, ліберальнага прэзідэнта Францыі, знайшлі ягоныя апаненты. Яны крытыкуюць яго за тое, што той не любіць пісьменніцу XVII стагоддзя. Мова пра графіню Мары Мадлен дэ Лафает, фрэйліну Ганны Аўстрыйскай, якая актыўна ўдзельнічала ў жыцці літаратурных салонаў і нават напісала чатыры раманы. У гісторыі літаратуры застаўся, праўда, толькі адзін з іх — «Прынцэса Клеўская», псіхалагічная проза пра няўдалае каханне аднаго герцага да прынцэсы. Твор дэ Лафает павінен ведаць кожны кандыдат на пасаду французскага чыноўніка (такія ўмовы). Сарказі тэст прайшоў, аднак тры гады таму неяк прызнаўся, што не любіць «Прынцэсу Клеўскую». У кантэксце праектаў Сарказі пачаць рэформу сістэмы адукацыі, каб зрабіць стаўку на прыкладныя навукі, тую заяву на днях згадала брытанская газета «Guardian». Французы — прыхільнікі захавання гуманітарных факультэтаў, учапіліся за гэта. Цяпер на вуліцах Францыі можна пабачыць шмат людзей са значкамі «Мне падабаецца «Прынцэса Клеўская». Адно з выданняў, скарыстаўшыся момантам, тэрмінова выдала кнігу дэ Лафает накладам 2000 экземпляраў, якія былі прададзены за два дні.

**Па матэрыялах «Тиждень» (Украіна)**



З НАГОДЫ

# НОВАЯ АПАЗІЦЫЯ МАЛДОВЫ

Алег НОВІКАЎ

**Палітычны крызіс у Малдове акрамя ўсяго значыць яшчэ і змену дэкарацый мясцовай палітыкі. Прыйшлі новыя палітыкі, стварылася новая апазіцыя. Найбольш аўтарытэтны сярод прадстаўнікоў новай хвалі — Дорын Кіртоакэ.**



Традыцыйна апазіцыю кіруючай ужо шэсць гадоў Партыі камуністаў Уладзіміра Вароніна ўзначальвала Хрысціянска-Дэмакратычная Народная Партыя (непасрэдны пераемнік Народнага фронту).

Калі згадваеш пра малдаўскіх хрысціянскіх дэмакратаў, адразу прыходзіць на памяць імя Юрыя Рошка. Рошка — Зянон Пазняк малдаўскай палітыкі. Ніхто больш так катэгарычна не патрабуе аб'яднання Малдовы з Румыніяй і развязання прыднястроўскага канфлікту любымі сродкамі.

Юрый Рошка сапраўды цудоўны аратар і харызматычная асоба. Між тым, калі паглядзець на электаральную дынаміку, то рэйтынг падтрымкі хрысціянскіх дэмакратаў на працягу апошніх дзесяці гадоў стабільна падаў. Цяжка сказаць, чым закончыцца цяперашняя гісторыя з падлікам галасоў, аднак апытанні, якія былі праведзеныя напярэдадні выбараў, сведчылі — партыя Рошкі ўвогуле можа не трапіць у парламент. Сітуацыя яшчэ больш непрыемная, калі ўзгадаць, што хрысціянскія дэмакраты маюць сталую матэрыяльную базу: іхнія выданні «*Тага*» і «*Flux*» фінансуюцца румынскім урадам.

**Стаўку ў выбарчай кампаніі камуністы робяць на расійскі фактар. Звычайна, калі падступаюць выбары, Варонін актывізуе кантакты з Масквой**

Называецца шмат прычынаў эрозіі лагеру хрысціянскіх дэмакратаў. Згадаем хаця б такі фактар, як архаічная нацыяналістычныя рыторыка (Рошка захапляецца часамі дыктатуры Антанеску), што слаба пасуе еўрапейскім настроям пакалення інтэрнэту і мабільных тэлефонаў.

Так ці інакш, на працягу апошніх гадоў у Малдове назіраўся працэс перазагрузкі на правым фланзе. З'явіліся новыя арганізацыі кшталту «Еўрапейскай акцыі» і новыя лідэры. Калі меркаваць па асвятленню падзей у СМІ, фрагментам новай хвалі малдаўскіх апазіцыянераў будзе Дорын Кіртоакэ.

Дорын Кіртоакэ нарадзіўся ў 1978 годзе ў Кішынёве. Закончыў юрыдычны факультэт Бухарэсцкага універсітэта. Праходзіў стажыроўку ў ЗША. Цікава, што пасля заканчэння вучобы на юрфаку пайшоў працаваць у забаўляльны бізнес. У 2001–2002 гадах вёў праграму «Surprize» на адным румынскім канале. Пасля займаўся рэалізацыяй праграм Хельсінскага камітэта па правах чалавека ў галіне свабоды прэсы і выбараў.

Паралельна Дорын пачаў спрабаваць сябе ў палітыцы. Яго дзядзька — старшыня Партыі рэформаў (з 2005 года Ліберальная партыя). Думаецца, не без яго дапамогі Дорын у 2005-м становіцца намеснікам старшыні партыі.

Яго першай акцыяй стала кампанія супраць рускамоўнай знешняй рэкламы і радыёстанцый, якія не выконвалі квоту на прысутнасць у эфіры румынскай мовы. Па Малдаўскіх законах, такая квота складае 60 працэнтаў. Кампанія закончылася частковым поспехам. Рэкламу на рускай мове прыбралі, а вось радыё пакінулі ў спакоі.

У ліпені 2005-га Дорын спрабуе сябе на выбарах прымара (мэра) Кішынёва і атрымлівае 7 працэнтаў (трэцяе месца). З-за адсутнасці яўкі прызначаюцца паўторныя выбары. На гэты раз кандыдат ад лібералаў апынуўся на другім месцы (25 працэнтаў), аднак у другім туры прайграў. Праз два гады Дорын зноў спрабуе сябе ў барацьбе за месца сталічнага мэра, але на гэты раз нечакана для ўсіх святкуе перамогу: за яго галасуе 61 працэнт выбаршчыкаў.

Перамога Кіртоакэ стала сенсацыяй. Усе чамусьці меркавалі, што Кішынёў «чырвоны горад». Між тым, камуністы на тых выбарах страцілі трэціну галасоў. На думку экспертаў, вынік выбараў быў не столькі перамогай Кіртоакэ, колькі паразай камуністаў. Непавага кампартыі да правоў грамадзян і бізнесу выклікала трывалую нелюбоў гараджан, асабліва людзей сярэдняга класа. Нават камуністычная прэса крытыкавала кандыдата ад камуністаў.

Галоўнымі пунктамі праграмы Кіртоакэ былі: гарантыі празрыстасці дзейнасці мясцовых адміністрацый, развіццё партнёрства з грамадзянскай супольнасцю, пачатак сістэмы электроннага кіравання (*Е-Кишинэу*), стварэнне службы «аднаго акна», правядзенне справядлівых конкурсаў пры працаўладкаванні, пашырэнне прысутнасці моладзі ва ўладных структурах.

У пачатку 2008 года мэр стаў удзельнікам скандалу: Toyota Camry, за рулём якой сядзеў гарадскі галава, урэзалася ў іншы аўтамабіль. Машыну Кіртоакэ развярнула і ўдарыла аб яшчэ адну машыну. Прычынай аварыі стаў менавіта мэр: ён праігнараваў знак, які патрабаваў ад яго саступіць дарогу.

Зараз яшчэ рана падводзіць вынік дзейнасці Кіртоакэ на пасадзе мэра Кішынёва, аднак сітуацыя ў краіне, якая склалася напярэдадні прызначаных на 5 красавіка выбараў у парламент, дазваляла лібералам спадзявацца хаця б на адносны поспех.

За шэсць гадоў свайго кіравання камуністы дасталі шмат каго. Іхнія штампы і спрадвечныя пошукі ворагаў не могуць кампенсаваць відавочныя памылкі: расійскі рынак згублены, нават ва Украіне пачалася палеміка наконт увядзення віз для грамадзян Малдовы, замарожаны канфлікт у Прыднястроўі, карупцыя, стабільна высокі ўзровень міграцыі і г.д.

Стаўку ў выбарчай кампаніі камуністы робяць на расійскі фактар. Звычайна, калі падступаюць выбары, Варонін актывізуе кантакты з Масквой і перацягвае на свой бок рускамоўнае насельніцтва — тых, хто настальгуе па добрых савецкіх часах. Па той жа схеме працавалі і ў гэтым годзе. У Кішынёў прыехаў дырэктар расійскага МЗС Лаўроў і эфектна заявіў пра адмену забароны на пастаўку малдаўскіх він у Расію.

Кур'ёзам выбарчай кампаніі кампартыі можна лічыць ролік з удзелам вядомага расійскага артыста Хазанава. Хазанаў, загрымаваны пад сярэднявечнага князя Стэфана Вялікага, заклікаў галасаваць за камуністаў. Феадал агітуе за камуністаў — лепшага прыкладу крызісу жанру цяжка прыдумаць.

Нягледзячы на такія правалы камуністаў, эксперты казалі, што далейшы лёс лібералаў будзе ў шмат чым залежаць ад умення Кіртоакэ і ягонага дзядзькі знайсці кампраміс з прадстаўнікамі нацыянальных меншасцяў (22 працэнта грамадзян Малдовы — украінцы, яўрэі, цыгане, рускія, балгары).

Лібералы выступаюць за ўваход Малдовы ў Еўрасаюз, інтэграцыю з Румыніяй, спрашчэнне атрымання карты румына, выхад Малдовы са складу СНД, уступленне ў NATO.

Такое наўрад ці спадабаецца старым людзям і рускамоўным малдаванам, аднак, як прадэманстравалі апошнія падзеі, лібералы карыстаюцца падтрымкай значнай часткі моладзі. Нават калі электаральная база лібералаў абмяжуецца толькі гэтай сацыяльнай групай, можна лічыць, што Дорын Кіртоакэ забраніраваў сябе месца ў вышэйшым дывізіёне малдаўскіх палітыкаў.

ЭКСПЕРЫМЕНТ

# УЛАСНЫЯ ГРОШЫ ЯК ВЫЙСЦЕ З КРЫЗІСУ

**Не хапае з-за крызісу беларускіх рублёў, доляраў і еўра? Завядзіце свае ўласныя грошы. Закранутыя фінансавым крызісам і, адпаведна, дэфіцытам грошай ЗША перажываюць сапраўдную моду на лакальныя валюты. Тэндэнцыя, як піша прэса, відавочная. Самая вялікая сетка дзейнічае ў штаце Масачусетс. Тут ужо надрукавалі 2,3 мільёна бонаў.**



Паколькі нортанскія грошы можна было абмяняць на звычайныя долары, іх ахвотна прымалі. Дзіўным чынам мадэль спрацавала: паперкі сталі паралельнай валютай

Янкі не прыдумлялі веласіпед. Ідэя мясцовых валют як сродку барацьбы з крызісам была ўпершыню выкарыстана ў часы крызісу 1929–1933 гадоў. Дарэчы, у канадскай правінцыі Альберта на хвалі поспеху сістэмы лакальнай валюты ў тыя часы нават узнікла масавая база пад асобную партыю — Партыю сацыяльнага крэдыту. Цяжка паверыць, аднак яе кандыдат перамог у 1936-м на выбарах губернатара.

Часам эксперыменты з лакальнай валютай мелі даволі цікавыя формы. У 70–80-я гады XIX стагоддзя ў Сан-Францыска жыў нехта Нортан, хворы на галаву багацей, які аднойчы абвясціў сябе імператарам Злучаных Штатаў і пратэктарам Мексікі. Нортан нават асобным указам распусціў кангрэс ЗША і акрамя ўсяго пачаў друкаваць свае грошы. Паколькі нортанскія грошы можна было абмяняць на звычайныя долары, іх ахвотна прымалі. Дзіўным чынам мадэль спрацавала: паперкі з выявай імператара ЗША сапраўды сталі паралельнай валютай.

У часы эканамічнай дэпрэсіі найбольш на гэтай глебе праславіўся аўстрыйскі горад Вёргль, жыхары якога ўвялі свае боны ў 1932 годзе. На той момант у Вёргле жылі 4000 чалавек. Калі пачалася дэпрэсія, беспрацоўе ў горадзе вырасла да астранамічнай лічбы — 30 працэнтаў. Тады мэрыя ўзяла крэдыт у Цэнтральным банку і выкарыстала яго як рэзерв пад лакальную валюту. Эксперымент атрымаўся. Была вырашана праблема адсутнасці грошай у гарадскім бюджэце. Тутэйшыя боны пайшлі перш за ўсё на вырашэнне праблемы беспрацоўя: муніцыпалітэт пачаў будаўніцтва. Будаўнікі атрымлівалі грошы ў мясцовай валюце. Паколькі выключна імі можна было аплачваць мясцовыя падаткі і камунальныя паслугі, боны ахвотна прымалі ў крамах. Ажыўленне гаспадаркі прывяло да каласальнага росту гарадскога бюджэту. За год ён павялічыўся ў 10 разоў! Больш таго, прыпыніўся рост цэнаў на прадукты.

Падзеі ў Вёргле выклікалі значную цікавасць з боку іншых гарадоў — ахвяраў крызісу. Іх мэрыі таксама пачалі ўводзіць мясцовыя грошы. Прыйшлося ўмяшацца чыноўнікаў Цэнтральнага банку: фактычна з-за моды на мясцовыя валюты ўзнікала пагроза краху нацыянальнай валютнай сістэмы. Вёрглю забаранілі працягваць друкаваць уласныя грошы.

Тым не менш на гэты час горад паспеў наведаць шмат эканамістаў, якія дэталёва вывучылі плюсы і мінусы эксперыменту.

Вось галоўныя вынікі іх студый:

1. Лакальная валюта можа рабіць абарот хутчэй, чым нацыянальная. Пры ўсім даверы да мясцовых валют, грамадзяне разумеюць, што гэта толькі эксперымент, і таму намагаюцца як мага хутчэй набыць нейкі тавар, а не пакінуць боны пра запас.
2. Лакальная валюта дазваляе камуне выкарыстоўваць вольныя працоўныя рэсурсы, эфектыўна змагацца з беспрацоўем і, як следства, быць стымулятарам росту попыту.
3. Паколькі мясцовая валюта выкарыстоўваецца толькі ў межах камуны, яна актывізуе дзейнасць лакальных прадпрыемстваў і службаў сервісу. Напрыклад, муніцыпалітэт пачынае будаваць мост. Усе заробкі працоўным ён плаціць у лакальнай валюце. На тутэйшыя грошы набываюцца і будаўнічыя матэрыялы. Значыць, у лакальнай валютнай зоне ўзнікае попыт на тыя матэрыялы, і нехта іх хутка выпускае.

Эксперыменты з лакальнай валютай працягваліся і пасля заканчэння вялікай дэпрэсіі. Напрыклад, у некаторых гарадах былой ГДР з канца 90-х існуе свая валюта. Маштабная практыка мясцовых валют мела месца ў Аргенціне пасля крызісу 2002 года.

Асабліва лакальныя грошы сталі папулярнымі з узнікненнем экалагічнага руху, прарокі якога лічаць, што сапраўднае экалагічнае сумленне можа мець месца выключна на лакальным узроўні, калі ты адчуваеш, што твае ўчынкі могуць непасрэдна паўплываць на стан навакольля. Экалагі выдумалі цэлую тэорыю зялёнага валютнага рэгулявання. Іх прываблівае той момант, што кіраўнік камунальнай службы, які адказвае за выдачу крэдытыў у лакальнай валюце, абіраецца сябрамі грамады, і, у адрозненні ад ананімнага і карумпаванага дырэктара нейкага банку, будзе глядзець у вочы людзям. Праўда, іншыя экалагі кажуць, што мадэль лакальных камунаў прыводзіць да ізаляцыі і неразумення глабальных праблемаў. Паспрабуй растлумачыць, што такое глабальнае пацяпленне.

Што да прыхільнікаў класічнай банкаўскай валютнай сістэмы, то яны крытыкуюць ідэю лакальных валют за яе лакальнасць. Мадэль лакальнага крэдытавання не дазваляе рэалізоўваць навуковыя праекты, распрацоўку новых тэхналогій, развіваць сучасную медыцыну.

Цяжка сказаць, што мы атрымаем у выніку цяперашняга буму лакальных валют.

У любым выпадку, чытаючы заходнюю палеміку наконт лакальных валют, узнікае дурная думка: сістэма лакальнай валюты даўно ўжо створаная ў Беларусі. Як вядома, у шматлікіх вёсках беларускай правінцыі дасюль паслугі можна аплаціць пляшкамі самагону.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ФРАНК-ВАЛЬТЭР ШТАЙНМАЕР

Лідэр нямецкіх сацыял-дэмакратаў будзе кандыдатам на пасаду кіраўніка ўраду на восеньскіх выбарах у бундэстаг. Дабівацца перамогі Франк-Вальтэр будзе з дапамогай літаратараў. Мова пра Гюнтэра Граса — лаўрэата нобелеўскай прэміі, аднаго з самых вядомых пісьменнікаў Германіі. Грас і Штайнмаер разам выйшлі на публіку ў час адной з выстаў. Пасля пісьменнік зрабіў рэкламу сацыял-дэмакратам, параўнаўшы цяперашні стан эсдэкаў з сітуацыяй канца 60-х гадоў. Тады, як і сёння, у краіне правіла вялікая кааліцыя сацыял-дэмакратаў і хрысціянскіх дэмакратаў, аднак на чарговых выбарах перамогу святкавалі ружовыя. Параўнанне Штайнмаера і Вілі Брандта (культавага лідэра эсдэкаў 60-х гадоў) выклікала смех на старонках нямецкай прэсы. Вядома, што Грас, чыя маладосць выпала на часы гітлераўскай дыктатуры і вайны, заўсёды выступаў супраць харызматычных палітыкаў.



### ВАЛЯНЦІНА МАТВІЕНКА

Губернатар Санкт-Пецярбургу вымушана заспакойваць горад на Няве, які кіпіць пасля спробы ўзарваць помнік Леніна на Фінскім вакзале. Атака на помнік правалілася. 300 грамаў траціла зрабілі ў Леніне дзірку, аднак сам помнік застаўся на месцы. Зараз яго рамантуюць. Між тым, назіраецца актывізацыя радыкальных сіл правага і левага кірунку. Напрыклад, ігумен храма на Лазараўскіх могілках адкрыта падтрымаў тэрарыстаў. «Я ўвогуле не магу прайсці каля помніка Леніну, каб у мяне не зачасаліся рукі абліць яго фарбай або ўзарваць», — сказаў ён. Камуністы збілі актывістаў «Адзінай Расіі», якія спрабавалі раздаваць улёткі «Камунізм — чума» на іх мітынгу. Пасля шпіталізацыі сваіх сяброў «Адзіная Расія» заявіла, што будзе судзіцца з КПРФ. Зюганоўцы ў адказ назвалі адзінаросаў «слабакамі» і «дзяўчынкамі». Палітолагі лічаць, што напружанасці спрыяе ананімнасць арганізатараў выбуху, якіх міліцыя да гэтага часу не знайшла. Адказнасць за тэракт узяў нейкі Залескі баявы лятучы атрад. Аднак, на думку большасці экспертаў, гэта арганізацыя прыдуманая. Замах на Леніна зрабілі больш салідныя групоўкі. Хто? Напрыклад, камуністы лічаць, што ў выбуху была зацікаўленая гарадская мэрыя і асабіста Валянціна Матвіенка.

### РАУЛЬ КАСТРА

Пераемнік Фідэля Кастра на пасадзе прэзідэнта Кубы адкрыў для сябе новую катэгорыю праціўнікаў рэжыму. Мова пра акцёраў-правакатараў. Менавіта як правакацыю расцаніла афіцыйная Гавана акцыю падчас выставы Biennale. Мастацкая акцыя праходзіла пад лозунгам «Інтэграцыя і супраціў у часы глабалізацыі». У праграме фестывалю былі таксама і перформансы. Адна з аматараў гэтага жанру Таня Бругуера падчас свайго выступу прадэманстравала пародыю на прамову Фідэля, якую ён зрабіў 8 студзеня 1959 года, праз некалькі дзён пасля перамогі рэвалюцыі. Гэту прамову кожны кубінскі школьнік ведае на памяць. Іншаземцы, якія прысутнічалі на выступе Тані, проста не маглі паверыць, што на Кубе такі ўзровень свабоды. Аднак на наступны дзень усё стала на свае месцы. Той перформанс афіцыйныя крыніцы назвалі правакацыяй супраць кубінскай рэвалюцыі. Саму Таню запісалі ў шэрагі «асобаў, якія стаяць на службе антыкубінскай прапаганды» і нават назвалі «прафесійнай дысідэнткай». Пакуль Таню пакінулі на волі — некаторыя эксперты лічаць, што выключна па той прычыне, што ўсе сілы рэпрэсійнай машыны кінутыя на барацьбу з блогерамі. Пасля таго, як на востраве дазволілі хатні інтэрнэт, сярод кубінцаў назіраецца мода на тое, каб весці жывыя дзённікі. Некаторыя нататкі на тых блогах не падабаюцца рэжыму.



▸ ТУРНІР

# КУПАЛАСЛЭМ З БУЛЬВАРА КАПУЦЫНАЎ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**5 красавіка ў Мінску адбылося мерапрыемства, якое арганізатары пафасна ахрысцілі Першым Купалаўскім Слэмам. Віктар Жыбуль атрымаў караоке, Алесь Камоцкі паказаў, якой маленечкай ён памятае Валярыну Куставу, а Аксана Спрынчан выйшла ў вакно.**

Слэм — забава, надзвычай модная цягам некалькіх прамінулых сезонаў у паэтычных колах Расіі і Украіны. Як і ўсё новае, яна даходзіла да Беларусі вельмі доўга. І вось нарэшце напачатку 2009 года на нефармальнай літаратурнай сцэне Мінска — слэм-бум. Адразу два мерапрыемствы такога фармату былі запланаваныя на красавік, і адно з іх паспяхова адбылося ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы ў нядзелю 5 красавіка. Нягледзячы на платны ўваход, яно сабрала каля 20 паэтаў-удзельнікаў, больш за 100 гледачоў і два тэлеканалы.

## Кавуном не шпурляцца!

Вядучы, дакладней, слэм-майстар, Андрэй Хадановіч напярэдадні шоу заўважна хваляваўся. Яго можна было зразумець: слэм — гэта ўсё няправільнае і нефарматнае ў сучаснай літаратуры, паэзія на мяжы спеву, перформансу і хуліганства — як на гэта ўсё паглядзіць бронзавы Іван Дамінікавіч? «Я быў на слэме, дзе выступоўца парэзаў на кавалкі кавун і стаў кідацца ім у канкурэнтаў, рэшту кавуна ён сервіраваў для журы. Лішне казаць, ён той слэм выйграў, — дзяліўся слэм-майстар з публікай у рэжыме разагрэву. — Дык вось, каб такога не было!» Намёк быў яўна ў адрас адной з удзельніц — Валярыны Куставай, якая вызначылася на слэме ўлетку мінулага года тым, што кідалася ў гледачоў морквай і бульбаю, выцягнутымі з дэкальтэ.




### Крыху тэорыі

Паэтычны слэм — турнір, дзе паэты спаборнічаюць у мастацкім чытанні вершаў. У сучасным выглядзе развіўся ў 1980-х у ЗША. Ёсць розныя правілы правядзення слэмаў. Класічны слэм мае тры туры: адбор, паўфінал, фінал. Забаронена выкарыстоўваць музычныя інструменты, але амаль заўсёды дазволеныя рэквізіты. Кожны ўдзельнік мае 3 хвіліны на самавыражэнне, пасля чаго атрымлівае адзнакі па пяцібальнай шкале ад глядацкага журы. Ацэньваюцца змест вершаў і артыстызм выканання. Істотная дэталь — стымулам для ўдзельнікаў часта з'яўляецца каштоўны прыз або значная сума грошай. Самым першым беларускім слэмам лічыцца слэм у фальварку «Добрыя мыслі», які адбыўся ў рамках Міжнароднага паэтычнага фестывалю «Парадак слоў–3» 1 жніўня 2008 года.

Зрэшты, у асаблівых засцярогах не было патрэбы — пляцоўка Купаласлэму, нягледзячы на шматкроць адзначанае падчас шоу імкненне дырэкцыі музею зрабіць мемарыяльную ўстанову больш сучаснай, цікавай, адкрытай моладзі, выклікала ў гэтай самай моладзі падсвядомы, містычны рэспект і навявала ёй інтэлігенцкія настроі.

Галоўным фактарам, што стрымліваў паэтычныя бясчынствы і глядацкі беспрадзел, была наяўнасць строгага аўтарытэтнага журы. Звычайна слэмы судзяць або толькі гледачы, або толькі мэтры. Камбінаванае судзейства, на думку арганізатараў, мусіла стварыць здаровы баланс кампетэнтнасці і дэмакратычнасці. У склад прафесійнага журы ўвайшлі літаратары-крытыкі Віктар Шніп, Людміла Рублеўская, Пятро Васючэнка, бард Алесь Камоцкі і дырэктарка Купалаўскага музею Алена Мацевасян. Журы сярод гледачоў чаргавалася паводле прыхамаці слэм-майстра.

Асноўная праблема, якую ў чарговы раз агаліў Купаласлэм, — суіснаванне ў беларускай літаратуры двух эстэтычна адрозных лагераў — мадэрністычнага і традыцыйнага. Само спалучэнне «Купалаўскі слэм» — гэта аксюмаран, традыцыя і наватарства ў адным флаконе. Можа, таму адносна ціхая, традыцыйная паэзія, якая ў іншай сітуацыі не мела б на такім спаборніцтве ніякіх шанцаў, на Купаласлэме была на вышыні… Але пра ўсё па парадку.

## Патрыятычны стрыптыз

Адборачны тур слэму прынёс шмат яскравых шоу. Нясвіжскі паэт Віктар Быль размаляў са сваім чаравікам, робячы выгляд, што гэта тапак, і расказваў гісторыю пра готку — Барбару Радзівіл і эма-Жыгімонта. Вера Бурлак скакала ў сукенцы, удаючы маленькую дзяўчынку. Віктар Жыбуль біўся галавой аб сцяну, але нябольна. Уладзь Лянкевіч спяваў ці то мантры, ці то харалы. Але найбольшы фурор выклікалі трохзвілінныя перформансы Аксаны Спрынчан і Алеся Туровіча. Першая расклала на зямлі тры белыя хусткі і пачала ілюстраваць вершы, здымаючы з сябе… чырвоныя сукенкі і кладучы іх на хусткі палоскамі. Калі на Аксане засталася апошняя, трэцяя сукенка, Андрэй Хадановіч не вытрымаў і закрычаў: «Прапаную не спыняць таймер на гэтым выступе!» Хлопцы ў залі стаілі дыханне: няўжо здыме сукенку? Дзяўчаты зашушукаліся: «Зараз сама ляжа!» Але Аксана падманула чаканні ўсіх, расклаўшы на хустцы асобнікі сваёй першай кнігі вершаў, таксама чырвоныя.

Выступ Алеся Туровіча ў адборачным туры — першае месца ўсяго турніру у маім асабістым унутраным рэйтынгу. Літаратар, якога амаль не чуваць апошнім часам, прадэманстраваў высокую марку перформера суполкі «Бум-Бам-Літ». Ён быў адзіным удзельнікам, хто аддаў павагу патрона мерапрыемства, склаўшы оду яго помніку, стылізаваную пад даклад купалаўскай канферэнцыі: «Купалу кавалі, кавалі Купалу, адлівалі, шуравалі, пілавалі…» — неслася над залай яго «навуковыя выкладкі». Гэта было сапраўды арыгінальна, актуальна і дасціпна. Нядзіва, што ён, як і Аксана Спрынчан, лёгка выйшаў у паўфінал слэму. Іншыя пяць удзельнікаў наступнага кола — Валярына Кустава, Глеб Лабадзенка, Сяржж Мядзведзеў, Віктар Жыбуль і Вера Бурлак.

Інтэрмедыі паміж турамі слэму забяспечваў яскравы моладзевы гурт «Босае сонца».

## Добры доктар Алкаголь

Многія ўдзельнікі толькі падчас самога слэму даведаліся, што гэта такое, і толькі ў працэсе спасцігалі, чым менавіта лепей уражваць гледача. Некаторыя так кранулі сябраў журы сваёй наіўнасцю і шчырасцю, што на іх праліўся дождж творчых сувеніраў і падарункаў. Самае цікавае пачалося, калі такія вось слэм-навічкі прайшлі ў другі тур. Найбольш перапалохалася Аксана Спрынчан: «Я падрыхтавала толькі адзін перформанс!» — заломвала яна рукі. Тым не менш, паэтка мабілізавалася і выкруцілася ў другі раз, што дазволіла ёй выйсці ў фінал. Таксама сіта паўфіналу здолелі прайсці Лабадзенка, Кустава і — з вялікім адрывам ад усіх — Жыбуль.

Ні для каго не было сакрэтам, што пераможцам стане менавіта ён. Ніякіх падтасовак і фальсіфікацый, проста Жыбуль быў найлепшым беларускім слэмерам, яшчэ калі ніякага слэму ў нас не было. Мала хто зможа адначасова скакаць на адной назе і чытаць вершы, пры гэтым пакідаючы ў вас няўлоўнае адчуванне, што гэта не проста клаунада — а значна горш, Паэзія. Паэтка Кацярына Зыкава, даведаўшыся, што выступоўцаў запрашаюць у алфавітным парадку, за дзень да слэму нават спрабавала ўзяць сабе псеўданім, каб не выступаць адразу пасля Жыбуля. Ён быў адзіны, хто набраў падчас конкурсу максімальную колькасць балаў за адзін выступ — 30. Гэта значыць, ён цалкам скарыў як пераборлівую публіку, так і строгіх прафесіяналаў.

Такі поспех меў паўфінальны тэкст «Добры доктар Алкаголь» — парадыйная паэма сацыяльнай накіраванасці, якая прымушае людзей шалёна рагатаць з саміх сябе. Увогуле ж два склады журы амаль заўсёды дэманстравалі палярнае стаўленне да пачутага. Гледачы былі больш эмацыйнымі, паблажлівымі, у той час як мэтры сурова сыпалі чацвёркамі.

## Караоке Беларускай Паэзіі

Вось жа, кола фіналістаў Купаласлэму склалі самыя яркія маладыя традыцыяналісты і Жыбуль, які фармальна таксама скарыстоўвае традыцыйную паэтыку, парадзіруючы яе па змесце. У адсутнасць Віталя Рыжкова, які не паспеў вярнуцца з паэтычнага фестывалю ў Харкаве, ролю сэкс-сімвала паспяхова выконваў узмужнелы і непаголены Глеб Лабадзенка з новымі моцнымі вершамі пра любоў і каханне.

Ён, аднак, не ўвайшоў у тройку прызёраў. Затое ў яе ўвайшла Аксана Спрынчан, якой для гэтага давялося выйсці ў акно Купалаўскага музею. Такім чынам яна імправізавана праілюстравала свой верш, дзе вялося пра выйсце з аўтобусу, якое адначасова — уваход у царкву. Сябры журы забыліся, што трэба ставіць адзнакі, пазрываліся з месцаў, пабеглі глядзець, ці не пабілася паэтка, ці мякка прызямлілася. Але пабачыўшы, што яна ўжо спакойна раздае інтэрв'ю тэлебачанню, супакоіліся і ацанілі яе скок на трэцяе месца. Валярына Кустава — срэбны прызёр Купаласлэму — на мой погляд, абсалютна заканамерна была адзначаная журы і публікай. 24-гадовая паэтка, у мінулым паэтычны вундэркінд, яна нядаўна адсвяткавала 15-годдзе творчай дзейнасці (Алесь Камоцкі: «Я ж цябе вось такууусенькай памятаю!»). Тым не менш, ёй цікава мяняцца, мадэрнізавацца ў тым, што яна піша. Вершы, прачытаныя ёй на слэме, — удалы, моцны прыклад такой мадэрнізацыі. Ну і перамогу, а з ёй і галоўны прыз — DVD-караоке — атрымаў Жыбуль. У фінале ён не разгубіўся, адрэагаваўшы на лірычны верш Аксаны Спрынчан пра аўтобус сваімі фантасмагарычнымі верлібрамі пра кантралёраў.

Што ж, Купаласлэм дасягнуў сваёй галоўнай мэты — стаў яскравым шоу і каталізатарам вясновага настрою. І — вяхой у развіцці айчыннага мастацтва вершавай дэкламацыі і літаратурнага перформансу. Яшчэ падчас самага першага беларускага слэму Андрэй Хадановіч падзяліўся сваімі планамі: «Мая мэта, як чалавека, які збіраецца паказаць такую забаву, як слэм, беларускаму гледачу, — зрабіць усё, каб гэты самы глядач зразумеў: слэм — таксама мастацтва».

Не сакрэт, што ў сваіх найгоршых праявах слэм — клубная, барная імпрэза, дзе шанец на перамогу мае той, хто гучней крычыць і сакавіцей мацюкаецца. Зрэшты, такі фармат даўно стаміў як паэтаў, так і гледачоў, — менавіта гэтым можна патлумачыць нязменны поспех беларускіх паэтаў з іх інтэлігенцкай манерай слэму на спаборніцтвах ва Украіне (апошнія дасягненні: Наста Манцэвіч выйграла Махнослэм у г. Гуляй-поле ў жніўні 2008 года, Віталь Рыжкоў — Эраслэм у г. Ужгарад у сакавіку 2009-га). Тым не менш, грубы фармат слэму мае ўсе шанцы дакаціцца і да Беларусі. «У гісторыі беларускага слэму я хачу быць камічнаўзнёслым містэрам Фёрстам, — з годнасцю зазначае Хадановіч, — а за мной няхай ўжо прыходзяць містэры Сэканды!»

У якасці фінальнага акорду Купаласлэму 5 красавіка дырэкцыя Купалаўскага музея ўручыла ўсім удзельнікам памятныя медалі «Янка Купала. Акопы» — відаць, выславіўшы такім чынам іх сваё пажаданне надзейна акапацца ў літаратуры.




### 30 красавіка — студэнцкі слэм «Бітва паэтаў»

Паэтаў (студэнтаў і не толькі), якія загарэліся ідэяй паўдзельнічаць у слэме, запрашаем дасылаць заяўкі і паэтычныя рэзюме на слэм «Бітва паэтаў» на электронны адрас ga.poetryslam@gmail.com ці прыносіць у рэдакцыю газеты БДУ «Універсітэт» (Бабруйская, 7, пакой 411) ці ў Прадзюсерскі клуб Інстытута сучасных ведаў «M&A Project group» (Філімонава, 69, кафедра культуралогіі, п.428) да 15 красавіка.

Усіх астатніх — ласкава запрашаем на фінал, які адбудзецца 30 красавіка а 18:00 у кавярні «Яблык» (вул. Карастаянавай, 32). Цікавосткі: вольны мікрафон, відэаінсталяцыя, усім удзельнікам фіналу — яблычны пунш.

КАШТОЎНАСЦІ

# КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУСІ

Святлана МАРОЗАВА

Працяг. Пачатак у №12 (140)

**На працягу больш як двух стагоддзяў працай шэрагу пакаленняў беларускага народу былі створаныя самабытныя каштоўнасці, звязаныя з дзейнасцю уніяцкай царквы. Яны сталі часткай нашай нацыянальнай культурнай спадчыны, але, на жаль, не знайшлі разумення і прыняцця тых, хто ў XIX стагоддзі ўсталяваў на беларускай зямлі вяршэнства праваслаўя. Духоўная пераарыентацыя на Усход, закліканая ўзмацніць палітычную інтэграцыю Беларусі ў склад Расійскай імперыі, суправаджалася знішчэннем культурнага набытку уніяцтва. Нішчылася любая мясцовая даўніна, якая не была падобная да расійскай. Пры гэтым не толькі вынішчалася уніяцкая традыцыя, але і перапісвалася наша гісторыя.**

## Новаўтвораныя храмы

Царкоўныя дзеячы і даследчыкі таго часу звярнулі ўвагу на беднасць, убоства, трухлявасць новаўтвораных храмаў, замест базыльянскіх. Як даносіў у 1842 годзе ў Сінод беларускі (смаленскі, віцебскі і магілёўскі) генерал-губернатар, «замест храмаў божых… паўсталі больш падобныя на запусцелыя хаціны, напаўразваленыя, ледзь прыкрытыя саломай і, звыш таго, абстаўленыя халупамі сялян, так што погляд на такія цэрквы нявольным чынам прыводзіць у збянтэжанасць душу праваслаўных, паноўную веру спавядаючых, жыхароў».

Цэрквы гэтыя, як даносілі ў 1855 годзе Мікалаю I, па сваім вонкавым выглядзе розняцца ад вясковых свірнаў толькі крыжам, усталяваным на даху. Убоствам вылучаўся і інтэр'ер. Як пісаў тагачасны даследчык Ізвекаў, тое, што было наспех зроблена падчас уз'яднання, уражвала прымітыўнасцю. Іканастасы там, дзе яны былі ўсталяваныя, уяўлялі брыдкую, нефарбаваную перагародку з дошак, на якой не змяшчалася ніводнай іконы. Там, дзе і меліся абразы, жывапіс на іх быў агідны і не адпавядаў святасці намаляваных выяваў. А на некаторых іканастасах былі вельмі старыя уніяцкія абразы. У далейшым патрэбы цэркваў задавальняліся дзякуючы дапамозе з боку ўраду







і добраахвотным ахвяраваннем дабрачынцаў з цэнтральнай Расіі, асабліва з Масквы.

Паводле статыстыкі 1857 года, у Літоўскай епархіі патрабавалася пабудова 22-х прыходскіх вясковых цэркваў, згарэлых, запячатаных ці зусім струхлелых, і капітальны рамонт або перабудова 290. Перабудоўваліся яны ў маскоўска-візантыйскім стылі. Не адзін дзесятак былых уніяцкіх храмаў, шэраг з якіх зменены да непазнавальнасці, стаяць і сёння на нашай зямлі.

## Наступ на арганы

Тыя экс-уніяты, што працягвалі наведваць сваю перахрышчаную на праваслаўе царкву, балюча ўспрымалі любыя нязвыклыя ёй новаўвядзенні. Сяляне Старакорненскага прыходу Літоўскай епархіі выказалі незадавальненне тым, што звон робіцца не так, як раней. Яны ўварваліся ў званіцу, перавязалі звону «языкі» і сталі званіць па-ранейшаму, а службу, які гэтаму перашкаджаў, скінулі адтуль. А ў адным з прыходаў Сядлецкай губерні ў канцы XIX стагоддзя адбыўся амаль анекдатычны выпадак — сяляне «адпалі назад у унію» пасля таго, як у іх царкве ўсталявалі ацяпленне, бо уніяцкія храмы не абаграваліся. Яны заявілі, што «печка — гэта прыстасаванне для практыкаванняў чортаў пекле».

У 1829 годзе ва ўсе культавыя ўстановы Літоўскай правінцыі было накіравана паведамленне грэка-уніяцкай калегіі, што яна лічыць неўласцівым грэцкаму набажэнству арганы і забараняе іх нанава ўсталёўваць у цэрквах. Рашучы наступ на арганы, лаўкі, званочкі, бакавыя стальцы распачаўся ў 1833 годзе.

1 ліпеня 1833 года Сямашка выдаў загад пра продаж арганаў, якія знаходзіліся ў Жыровіцкім кафедральным саборы, таму што яны нібы *«занимают напрасное место в соборе и безобразят вид онаго»*. Калі ж не знаходзілася пакупнікоў, арганы трэба было разабраць і матэрыялы выкарыстаць па іншаму прызначэнню.

З канца 1835 года кампанія набывае масавы характар. Мясцовым уладам загадвалася прыбраць арганы, дзе яны ёсць, і адрапартаваць начальству да 1 мая 1836 года. 11 лютага 1836 года кансісторыя вызначыла трохмесячны тэрмін іх продажу. Арганісты пазбаўляліся службы ў царкве або прызначаліся на іншыя духоўныя пасады. З месяцаў пачалі паступаць справаздачы пра выкананне загаду: ад лідскага, слонімскага, брэсцкага, кобрынскага, пружанскага, ваўкавыскага, наваградскага земскіх спраўнікаў.

У сакавіку гэтага года Сямашка піша гродзенскаму губернатару, што арганы перашкаджаюць царкве, іх захаванне *«могло быть поводом к соблазну»*, і даводзіць да яго ведама, што ў храмах Літоўскай епархіі яшчэ засталося 86 гэтых музычных інструментаў. Але справа ішла марудна. Народ не хацеў развітвацца з арганамі. Таму з другой паловы 1836 года зусім забараняліся іх выкарыстанне.

Як успамінаў у 1836 годзе маладыя праваслаўны бацюшка, прысланы са Смаленска ў былы уніяцкі прыход, ён прываблівау сялянаў у перахрышчаную царкву з дапамогай таннай сівухі. Такі пачастунак быў, паводле ягоных словаў, «славным средством для уловления сих отчаянных любителей «гарелцы».

Калі святар зваў сялянаў на абедню, у яго спыталі: «*А на варгане повинны б грать?*» На што ён адказаў: «*Не, некому, детуньки, некому… Почекайте! Я привезу от Полотська органиста…*» Але з тых часоў ніхто з іх не прыходзіў да яго на імшу, як успамінаў протаірэй, таму што «орган молчит»: «*Так тянулось до вербного воскресенья, а отсюда всё пошло по маслу. Прихожане уважили Казённую Палату, которая стала угощать их лучше меня — палками*».

Пазбаўленне беларускіх уніятаў велічнай музыкі, сугучнай настрою набажэнства, сталася адной з тых падставаў, якія схілілі частку насельніцтва да каталіцтва. Так, прыхаджане царквы м. Крывічы Вілейскага павету адышлі да касцёлу пасля скасавання уніі, «знаходзячы сабе духоўную ўцеху ў велічным касцёле з гучным арганам».

Ужо ў пачатку XX стагоддзя невядомы аўтар, заклапочаны занепадам у заходніх губернях імперыі праваслаўя, раіў на старонках «Царкоўнага весніка» (за 1906 год) выправіць зробленую памылку шляхам дапушчэння ва ўжытак праваслаўнай царквы Беларусі музыкі — «прыемнай асаблівасці старадаўняй веры беларусаў», скасаванай па-за яго воляй і згодай. Гэта было б справядлівым аднаўленнем таго, да чаго беларусы набылі векавую звычку яшчэ ў часы уніі.

Выкараняліся уніяцкія набажэнскія спевы. У 1867 годзе расследавалася справа пра спяванне прыхаджанамі Кляшчэльскай праваслаўнай царквы Бельскага павета уніяцкіх псалмоў.

## Замена абрадаў

Пастановамі 30-х гадоў XIX стагоддзя адмяняліся ўсе абрады, неўласцівыя рускай царкве. У 1835 годзе было забаронена адступаць ад «абрадаў рускага набажэнства… ліквідуючы па магчымасці… навіны, праціўныя духу… устанаўленняў царквы ўсходняй». Але святары тайна выконвалі ў далучаных да праваслаўя прыходах старыя абрады.

Калі святары Перавалачнянскай царквы ў 1839 годзе рабілі хросны ход паводле праваслаўнага абраду, то народ не пайшоў за імі, узняўшы лямант. Не дапамаглі яго супакоіць ні ўшчуванні духавенства, ні прыбыўшы на месца здарэння жандар. Расследаванне паказала, што людзі разглядаюць змену ранейшых абрадаў як змену важнейшых канонаў уніяцтва. «*Неизменное удерживание в униатских церквах прежних отступлений и римских нововведений*, — пісаў у 1836 годзе з Пецярбурга граф Пратасаў, — *сильно действует на умы возвратившихся в православие простолюдинов, которые, видя немалую разницу между богослужением униатским и греко-российским, ослабевают в веровании и убеждении, что прежняя вера их есть почти та же, что православная, и отпадают в унию*».

Але, нягледзячы на ціск духоўных і свецкіх уладаў, народ яшчэ доўга захоўваў прыхільнасць да сваіх абрадаў, байкатуючы пры гэтым абраднасць, што навязвалася яму звонку. Таму выкараненне «даўніны» расцягнулася на дзесяцігоддзі. У 1859 годзе мясцовая жандармерыя інфармавала вышэйшыя інстанцыі пра «ўпартасці, асабліва што да хросных ходаў», былых уніятаў Гродзенскай губерні, якія жывуць у сумежных раёнах з Каралеўствам Польскім. Прыхаджане Кляшчэляўды шэрагу іншых вясковых прыходаў на патрабаванне епархіяльнага начальства рабіць хросны ход паводле праваслаўнага звычаю пачалі наракаць, і да 160 чалавек сталі ўхіляцца ад наведвання царквы. Яны адмаўляліся ўдзельнічаць у такіх працэсіях, гаворачы, як бацькі іх і дзяды хадзілі па сонцу, так і яны не пойдуць супраць сонца; што ісці ў такім ходзе значыць ісці супраць Хрыста.

Адмене падлягалі святы, якіх няма ў праваслаўнай царкве. Замест запазычанага ў каталікоў свята Божага Цела, да якога народ меў асаблівую прыхільнасць, В. Лужынскі прыдумаў і ўвёў новае — свята ў памяць уз'яднання уніятаў.

## Аблічча святара

Схільнае да змены веры уніяцкае духавенства раптам сутыкнулася з нечаканай перашкодай — з рызыкай быць абсмяяным тутэйшым жыхарствам з прынцыпам аблічча рускага папа. Даючы ў 1833–1834 гадах падпіскі на згоду прыняць праваслаўе, святары агаворвалі за сабой права галіць бараду і стрыгчы на галаве валасы паводле свайго звычаю, насіць уніяцкае святарскае адзенне, паколькі барада і раса былі ў вялікай пагардзе ў краі. Прымаючы да ўвагі, што «ў барадзе рэлігіі няма», урад пайшоў насустрач — нейкі час не патрабавалася яе «адгадоўваць», было дазволена пакінуць і ранейшае адзенне. Разлік быў на тое, што, не заўважыўшы вакол сябе ніякіх зменаў, вернікі пагодзяцца з далучэннем іх духавенства да грэка-рускай царквы.

Падлягаў выкараненню шырока распаўсюджаны звычай даваць пры хрышчэнні імёны святых, шанаваных уніяцкай царквой. Святароў абавязалі называць нованароджаных толькі імёнамі, унесенымі ў праваслаўныя святцы. У 1843 годзе перайменавалі вучняў Літоўскай семінарыі, чые імёны не ўпісваліся ў дазволеныя рускія праваслаўныя нормы.

**Заканчэнне ў наступным нумары**

## ЛІСТЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

### МУЗЫКА, ЯКАЯ ЯДНАЕ

Мне надарылася дзень 25 сакавіка пражыць у Вільні. Імжыста-няўтульнай раніцай на нешматлюднай вуліцы Майроні, чыя брукаванка памятае крокі Шырмы, Сеўрука, Сергіевіча і іншых выдатных беларусаў, недалёка ад гатычнай перліны Еўропы, касцёла св. Ганны і побач з бялюткай Прачысценскай царквой, насупраць бернардзінскага парку, чорную графіку дрэваў якога шчыльна апанавалі вялізныя пенапластавыя птушкі-інсталяцыі, я чакаў сябра. Са стану прыўзнята-філасафічных мрояў да дня сённяшняга вярнуў аэраграфічны надпіс на аўтобусным прыпынку — «Тут быў Вася!» (зразумела, па-літоўску).

Бліжэй да абеду надвор’е палагаднела. Калі беларуска-літоўская грамада ўскладала кветкі памяці і пашаны пачынальнікам Беларусі і БНР Івану і Антону Луцкевічам, а таксама Ёнасу Басанавічусу, па над могілкамі «Роса», у блакіце неба купаліся асляпляльна белыя аблокі.

Ва уніяцкай, Святатроіцкай царкве, што ў Базыльянскіх мурах, каля будынку былой Віленскай беларускай гімназіі адбылася Імша за Беларусь.

Падарункам да свята Дня Волі сталася выстава ў Арсенале (у памяшканні музея дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва) — «Еўрапейскі краявід XX ст.». Цікавага ў экспазіцыі было багата, але ў зорным складзе рэпрэзентаваных аўтараў, дзе, дарэчы, прадстаўлены і заходнебеларускія творцы, скалануў сэрца выдатны жывапісны краявід «Перад бурай» мастака-гулагаўца Зм. Крачкоўскага. Поўны лірычнай прыгажосці і затоенай, выбуховай энергіі, твор передае дух Беларусі. (Гэта, бадай, адзіны, з вядомых маляўнічых твораў майстра ўвогуле. Рэч у тым, што, па прызнанні аўтара, свае жывапісныя творы ён знішчыў па прыходзе вызваліцеляў).

Вяршыняй урачыстасцяў Дня Волі стаўся святочны канцэрт, які адбыўся надвячоркам у Камернай зале Акадэміі музыкі і тэатра (блізу тэатра Оперы на вул. Тілта, вобраз якой добра сцверджаны ў жывапісных і графічных творах М. Дабужынскага). Хвалюючаму выступу мінскіх гасцей, пестунам хормайстра Кірыла Насаева, былога кіраўніка «Уніі», папярэднічала некалькі далікатна кароткіх прамоваў прадстаўнікоў беларускай і літоўскай грамадскасці. Імпрэза, прапанаваная маладым і надзвычай перспектыўным калектывам, парадавала прысутных не толькі чысцінёй і мілагучнасцю маладых галасоў, але і багаццем рэпертуару — як нацыянальнага, так і тэматычнага. (Сімвалічна, што выступ гэты стаўся, па сутнасці, нараджэннем новага музычнага калектыву, якое адбылося ў музычнай сталіцы аб’яднанай Еўропы).

Напрыканцы стоячы праслухалі ўдзячныя ўдзельнікі ўрачыстасцяў нацыянальны гімн Беларусі — «Магутны Божа».

Канаў і адыходзіў дзень 25 сакавіка, а ў душы яшчэ гучала і гучала музыка… Музыка, якая яднае.

**Сяргей Гваздзёў**

### ПРАПАНУЮ ДЫСКУСІЮ

Шаноўная рэдакцыя, я шчыра ўдзячны вам за цікавую газету. У «Новым Часе» я знайшоў шмат пазнавальных і глыбокіх матэрыялаў, прысвечаных пытанням культуры і гісторыі нашай Бацькаўшчыны, славутым асобам мінулага. На жаль, зараз амаль не засталося перыядычных выданняў, якія асвятлялі б гэтыя тэмы. Кудысьці знік часопіс «Спадчына», і ўжо яго даўно няма ў кнігарнях. Распавядзіце на старонках газеты пра лёс «Спадчыны». Ці яна яшчэ выдаецца, ці часопіс знік назаўсёды?

Прапаную таксама зладзіць у «Новым Часе» абмеркаванне праблемы страты нашай нацыянальнай самабытнасці і непаўторнасці, зрусення беларусаў, няведання сваёй гісторыі і нацыянальнай культуры. На маю думку, варта нават распачаць дыскусію, зрабіць новую рубрыку, дзе будуць змяшчацца супрацьлеглыя пункты гледжання на гэтыя праблемы, публікавацца розныя погляды і прапаноўвацца шляхі развіцца нашай краіны ў XXI стагоддзі.

**Антон Дацкевіч**




## КНІГАРНЯ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКІХ ВАЙСКОВЫХ ФАРМАВАННЯЎ

Сяргей ЧЫГРЫН

**У сённяшняй афіцыйнай дзяржаўнай гістарыяграфіі Рэспублікі Беларусь гісторыя беларускіх вайсковых фармаванняў пачынаецца з 1941 года. Ну, магчыма, яшчэ з крэйсера «Аўроры», дзе служыла нямала беларусаў. Але не раней...**




Нядаўна прывёз мне сябра з Мінска дзве кнігі майго земляка, сённяшняга міністра абароны Рэспублікі Беларусь Леаніда Мальцава. Адна з іх называецца «*Вооружённые Силы Республики Беларусь: История и современность*». Вось, думаю, тут я знайду хоць адзін раздзел па гісторыі вайсковых фармаванняў Беларусі.

Пачаў чытаць, спадзеючыся, што менавіта тут і згадаюцца беларускі вайскова-палітычны рух у 1917–1918 гадах, Беларуская вайсковая цэнтральная рада, беларускія атрады ў літоўскай арміі, дзейнасць генерала Станіслава Булак-Балаховіча, Слуцкае паўстанне і г. д. Ды дзе там! Урокі і вынікі гісторыі беларускіх ваенных фармаванняў беларускі генерал Мальцаў пачаў з «*уроков Великой Отечественной войны в контексте современных задач реформирования Вооружённых Сил*». Таму мае рацыю Алег Латышонак, калі ва ўступе да сваёй фундаментальнай працы «Жаўнеры БНР» не згадваў кнігу Мальцава, ды і ранейшыя савецка-бальшавіцкія кнігі, якія свядома адмаўлялі існаванне беларускіх вайсковых фармаванняў.

Пра іх і сёння ў Беларусі мала пішацца і друкуецца. Хаця сёетое свет ужо пабачыла, пра што сказаў ва ўступным слове Алег Латышонак і станоўча ацаніў гэтыя выданні.

Тады, у 1995 годзе, калі ў Беластоку на польскай мове ўпершыню выйшла з друку яго кніга «*Bialoruskie formacje wojskowe 1917–1923*», я падумаў: вось бы гэтую кнігу перакласці на беларускую мову, выдаць яе добрым накладам і забяспечыць усе кнігарні, а таксама бібліятэкі, ваенныя ўстановы і школы Беларусі. Нарэшце — дачакаўся. Але мала веры, што «Жаўнеры БНР», напрыклад, трапяць у школы ці ваенныя ўстановы. Бо нават прэзентацыі кнігі ў некаторых месцах у Беларусі сёння забараняюць. Тым не менш, кніга ёсць, кніга з’явілася, кнігу купляюць, кнігу чытаюць...

Алег Латышонак зрабіў аб’ектыўны, грунтоўны, зразумелы чытачам гістарычны агляд беларускіх вайсковых фармаванняў напачатку XX стагоддзя. Нялёгкі лёс быў у беларускіх жаўнераў, як да пачатку першай сусветнай вайны, так і пасля 1917 года. І, наогул, мае рацыю гісторык Латышонак, які, падсумоўваючы перыяд развіцця вайсковых фармаванняў на Беларусі, падкрэсліў, што «за незалежнасць Беларусі змагаліся ў той час дзесяць з лішнім тысяч чалавек. Гэтая колькасць — невялікая, але гэта былі выключна добраахвотнікі».

Беларускія стабільныя, надзейныя вайсковыя фармаванні ў пачатку XX стагоддзя ў час, калі розныя акупанты тапталі Беларусь, стварыць было цяжка. То рускія, то бальшавікі, то немцы, то палякі дужа баяліся гэтых аб’яднаных беларускіх ваенных фармаванняў, І яны стараліся зрабіць усё, каб стварэнне беларускага войска не атрымалася, зацягнулася, адкладвалася. Таму, як піша гісторык, афіцэры і жаўнеры беларускага войска не змаглі заваяваць незалежнасці Беларусі. Але яны здолелі давесці, што і беларусы імкнуцца да сваёй незалежнасці, што і беларусы могуць ваяваць (ваявалі ж пад рознымі сцягамі) не на баку тых ці іншых акупантаў, а на сваім баку, за сваю Бацькаўшчыну. Пазней беларусы даказалі, нягледзячы на ўсе памылкі, сваю вайсковую сілу пры баявых дзеяннях Першай Слуцкай стралковай брыгады.

Шмат радкоў у кнізе Алега Латышонка прысвечана генералу Станіславу Булак-Балаховічу. Наогул, пра Булак-Балаховіча варта напісаць добрую кнігу і выдаць яе па-беларуску для беларусаў. Бо палякі даўно пра яго пішуць (Marek Cabanowski. General Stanislaw Bulak-Balachowicz, Warszawa, 1993 і інш.), а мы заўсёды спазняемся.

У апошнім раздзеле кнігі змешчаны артыкулы, якія непасрэдна звязаныя з гісторыяй беларускага войска, з Беларускай Народнай Рэспублікай. Гэта матэрыялы, якія асобна друкаваліся ў беларускім і польскім друку, але яны вельмі добра ўпісваюцца ў кантэкст усёй кнігі. Гэта артыкулы, прысвечаныя дзяржаўнай сімволіцы БНР, Алесю Гаруну, які займаўся не толькі літаратурай, але і палітыкай, быў выбраны памочнікам старшыні Усебеларускага кангрэсу ў снежні 1917 года, быў радным Рады БНР.

Кніга Алега Латышонка «Жаўнеры БНР» вартае ўвагі і з’яўляецца несумненна важнай крыніцай для вывучэння гісторыі беларускіх вайсковых фармаванняў. І яшчэ: вельмі хочацца спадзявацца, што яна трапіць у рукі міністра абароны Рэспублікі Беларусь Леаніда Мальцава, і ён яе ўважліва прачытае, а таксама загадае прачытаць сваім генералам і афіцэрам.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 10.03.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.